


ШОК ПРЫБАЛТЫЙСКАГА АФІЦЫЁЗУ 5



ЯК ВЯСНА ЎПЛЫВАЕ НА ЗДАРОЎЕ 6

7 КРАСАВІКА 2021 г. СЕРАДА
№ 64 (29433)
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА

З першых вуснаў

## «Мінулы год стаў выпрабаваннем на трываласць не толькі ўлады, але і дыпламатычных кадраў»

Прэзідэнт правёў нараду па аптымізацыі беларускіх загранустаноў



Фота БелТА.

**Але размова не ішла выключна пра скарачэнне прадстаўніцтваў. Вырашалі, якім чынам і на якіх знешніх вектарах перафармаціраванне работы дыпламатаў прынясе большую эфектыўнасць, перадусім эканамічную. Другая частка нарады датычылася палітычных пытанняў — праблемных момантаў ва ўзаемаадносінах з суседзямі. Асаблівая ўвага — адносінам з Польшчай.**

### ЗАКРЫЦЬ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ

Праблемы знешняй палітыкі пастаянна выносяцца на разгляд кіраўніка дзяржавы, і гэта мерапрыемства шмат у чым носіць планавы характар, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Свет імкліва змяняецца, і нам неабходна адэкватна адаптавацца і правільна распараджацца наяўнымі рэсурсамі. Па ўсіх кірунках, у тым ліку і ў МЗС. ***Разам са шматлікімі рызыкамі і пагрозамі з'яўляюцца і новыя магчымасці. Ва ўмовах канкурэнцыі пераможа той, хто зможа імі правільна скарыстацца***», — сказаў Прэзідэнт.

Пандэмія справакавала глабальны крызіс, змяніла структуру сусветнага гандлю, аднак вынікі мінулага года сведчаць, што Беларусь змагла захаваць свае пазіцыі на замежных рынках, у тым ліку дзякуючы эфектыўна выбудаванаму механізму знешнеэканамічных сувязяў. «Відавочна, што дружалюбнай для нас з'яўляецца тая краіна, дзе пакупнік галасуе сваім рублём, доларам ці еўра за беларускі тавар ці паслугу, а ўрад гэтаму не перашкаджае, а, наадварот, садзейнічае», — выказаў думку кіраўнік дзяржавы.

Інтарэсы нашай краіны за мяжой прадстаўляюць 70 замежных устаноў у 58 краінах, на долю якіх прыпадае амаль 97 % беларускага экспарту і 76 % замежных інвестыцый. Прэзідэнт мяркуе, што ў цэлым сістэма органаў дыпламатычнай службы дазваляе вырашаць пастаўленыя задачы. Пытанне толькі ў тым, наколькі яна эфектыўная з пункту гледжання выдаткаваных на яе ўтрыманне сродкаў і рэальных вынікаў па абароне інтарэсаў.

«Ці ёсць магчымасць пераразмеркаваць людзей для вырашэння ключавых задач там, дзе нас чакаюць і гатовыя з намі працаваць, не прад'яўляючы ніякіх ультыматумаў? ***Мінулы год стаў выпрабаваннем на трываласць не толькі ўлады, але і дыпламатычных кадраў, якія павінны дзейнічаць выключна ў інтарэсах сваёй краіны.*** На жаль, не ўсюды атрымалася так, як мы хацелі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў увагу, што Беларусь — невялікая дзяржава і не мае бязмежных магчымасцяў фінансаваць разадзьмутыя штаты дыпламатаў за мяжой. «Навошта? Мы ад глабалізму не пакутуем, калі казаць пра перспектывы. У нас звычайныя зямныя пытанні і праблемы, як у палітыцы, так і ў эканоміцы. Да таго ж на першым плане павінна быць не прэтэнзія на лідарства, а абарона і прасоўванне сваіх інтарэсаў у эканамічнай сферы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

СТАР. 2

# Гаспадарскі клопат



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сяргей СІМАКОЎ, жыхар вёскі Вікоў Рагачоўскага раёна, рамантуе дзедаў дом, у якім збіраецца жыць разам з сям'ёю.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Выдаткі на аказанне жыллёва-камунальных паслуг у будучай пяцігодцы будуць зніжацца, як і цяпер, — шляхам скарачэння выдаткаў на паліўна-энергетычныя рэсурсы, выканання энергазберагальных мерапрыемстваў, памяншэння страт цеплавой энергіі, страт і няўлічаных выдаткаў вады, аптымізацыі колькасці работнікаў, а таксама іншых арганізацыйных і тэхнічных мер. Эканамічным механізмам стымулявання па-ранейшаму будзе планаванне і фінансаванне дзейнасці арганізацый ЖКГ па планава-разліковых цэнах».*

Дзяржаўны інтарэс

## ЭНЕРГІЯ ІНВЕСТЫЦЫЙ

Як у раёне, пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС, развіваецца эканоміка і ствараюцца рабочыя месцы

**Моцныя рэгіёны — адзін з прыярытэтаў развіцця нашай краіны ў цэлым. Пра тое было сказана кіраўніком дзяржавы на Усебеларускім народным сходзе і гэта прапісана ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку. Тэрыторыям, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, — увага асаблівая. Тут рэалізоўваюцца праекты, якія дапамагаюць стварыць годныя ўмовы жыцця і працы для людзей. За перыяд дзеяння праграмы па пераадоленні наступстваў трагедыі на ЧАЭС, пачынаючы з 2011 года, толькі ў эканоміку Касцюковіцкага раёна было накіравана больш чым 41 мільён рублёў з усіх крыніц фінансавання. Прэферэнцыі Указа № 235 (аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёвага ўсходу Магілёўшчыны) далі раёну новы імпульс для развіцця рэальнага сектара эканомікі, сацыяльнай сферы, стварэння камфортных умоў жыцця для насельніцтва.**

СТАР. 3



Васіль СЫРВАЧОЎ лічыць, што новыя высокатэхналагічныя рабочыя месцы — перспектыва для развіцця малых населеных пунктаў.

Беларусь памятае

## ПЯЦІ ВОІНАМ І ДВУМ НЕВЯДОМЫМ САЛДАТАМ

Нямала помнікаў ахвярам вайны стаіць у лясах, на ўзбочынах, на месцах былых вёсак. Іх даглядаюць нераўнадушныя суайчыннікі

**З больш чым дзевяці тысяч брацкіх магіл, помнікаў, мемарыяльных комплексаў нашай краіны, якія звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, амаль 900 знаходзіцца на Брэстчыне. Усяго ў вобласці пахавана звыш 421 800 ахвяр вайны. Вядомыя імёны толькі кожнага восьмага з іх. Вялікая колькасць помнікаў усталявана ў лясах, — у нас кожны метр зямлі, лічы, гісторыя. Таму помнік часам можна сустрэць далёка ад населенага пункта, нават ад дарогі.**

### Грамнічныя слёзы па расстраляных

Сярод іх сустракаюцца самыя розныя. Часцей гэта тыповыя савецкія манументы другой паловы XX стагоддзя, але больш у лясах, на ўзбочынах простых, часам прымітыўных, помнікаў. Іх нярэдка ўстанаўлівалі самі жыхары, якія памяталі землякоў і сваякоў. Такія пазнакі не менш каштоўныя для справы памяці, бо за кожнай — свая гісторыя, трагедыя, свае ахвяры.

СТАР. 3



Помнік каля былой вёскі Арол.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Агульная капіталізацыя рынку крыптавалют упершыню перавысіла $2 трлн

Гэта рэкорднае значэнне, паводле даных трэкераў CoinGecko і Blockfolio. Капіталізацыя біткоіна перавысіла 1,1 трыльёна долараў, вынікае са звестак CoinMarketCap. Росту паспрыяла павышэнне цікавасці да крыптавалют з боку як інстытуцыйных, так і рознічных інвестараў на працягу апошніх некалькіх месяцаў, адзначыла агенцтва Reuters. Як вядома, у пачатку лютага вытворца электрамабіляў Tesla мільярдэр Ілан Маск уклаў у біткоін 1,5 мільярда долараў, а сацыяльная сетка Twitter заявіла, што задумалася пра тое, каб разлічвацца з супрацоўнікамі і партнёрамі ў гэтай «крыпцe». Кіраўнік сэрвісу Джэк Дарсі яшчэ ў 2018 годзе прагназаваў, што на працягу дзесяці гадоў біткоін стане «адзінай валютай» інтэрнэту. Днямі курс Ethereum дасягнуў гістарычнага максімуму, пераадолеўшы адзнаку $2100. Росту спрыяла падтрымка Visa, якая ўпершыню стала праводзіць крыптавалютныя транзакцыі з выкарыстаннем Ethereum, а таксама словы мільярдэра Марка Кьюбана, які заявіў, што эфір «бліжэй за ўсё да сапраўднай валюты». Бізнесмен таксама паведаміў, што яго крыптапартфель на 30 % складаецца з токенаў Ethereum, а на 60 % — з біткоінаў.

### Вайскоўцы Мазамбіка адбілі ў ісламістаў горад Палм



Ваенныя заяўляюць, што вярнулі кантроль над гэтым населеным пунктам, які знаходзіцца на поўначы краіны. Палм больш чым тыдзень таму быў захоплены ісламістамі. Па словах армейскага прадстаўніка, у ходзе аперацыі была забіта значная колькасць баевікоў. Дзяржаўныя СМІ паведамляюць, што жыхары, якія збеглі ад гвалту ісламістаў, вяртаюцца ў свае дамы. Паводле прыблізных ацэнак, горад пакінула каля 11 тысяч чалавек. Дзясяткі мірных жыхароў былі забітыя за мінулы тыдзень. Узброены канфлікт паміж джыхадзістамі з групоўкі, вядомай у гэтых месцах як «Аш-Шабаб», і вайскоўцамі ў правінцыі Кабу-Дэлгаду на поўначы Мазамбіка працягваецца з 2017 года. З тых часоў было забіта каля 2,5 тысячы мірных грамадзян, каля 670 тысяч збегла з родных краёў. Напад баевікоў на Палм 24 сакавіка стаў самым дзёрзкім і кровапралітным за ўвесь час канфлікту. Насельніцтва горада складае прыкладна 75 тысяч чалавек. Сярод загінулых ёсць грамадзяне Вялікабрытаніі і ПАР. У сувязі з апошнім абвастрэннем французская карпарацыя Total прыпыніла развіццё свайго шматмільярднага газавага праекта непадалёк ад Палма. Супрацоўнікі кампаніі былі эвакуіраваны з зоны канфлікту.

### У ЗША кожная шостая сям'я з дзецьмі сутыкнулася з недахопам ежы

Каля 22 мільёнаў амерыканцаў сутыкнулася з праблемамі недахопу ежы і сродкаў для куплі прадуктаў, паведамляе Business Insider. У студзені прэзідэнт ЗША Джо Байдэн падпісаў распараджэнне аб дапамозе сем'ям у атрыманні прадуктаў харчавання. Штомесяц улады краіны выдзяляюць больш за $1 млрд у выглядзе прадуктовых талонаў. Таксама быў павялічаны памер дапамогі цяжарным жанчынам і сем'ям з дзецьмі. Адміністрацыя санкцыяніравала найбуйнейшую ў гісторыі праграму гадавога кармлення дзяцей. «Гэта фундаментальныя перамены», — цытуе New York Times эканаміста з Універсітэта Кентукі Джэймса Зіліяка. Пандэмія сур'ёзна паўплывала на фінансавае становішча мільёнаў сем'яў у ЗША, што прывяло да недахопу прадуктаў. І для таго каб пракарміцца, ім даводзілася разлічваць толькі на дапамогу харчовых банкаў.

ISSN 1990 - 763X
21064>
9 771990 763008

КОРАТКА

- **Нацбанк вынес на абмеркаванне праект указа аб функцыянаванні рахункаў фізічных асоб.**
- Раннія яравыя пасеялі ў Беларусі больш чым на 25 % плошчаў.
- **СААЗ выказалася супраць увядзення пашпартоў вакцынацыі ад COVID-19 для паездак.**
- Больш цяжкія выпадкі клешчавога энцэфаліту сталі часцей сустракацца ў Беларусі.
- **МАЗ адкрыў новы сэрвісны цэнтр ва Узбекістане.**
- Для работы ў студатрадах запісаліся 10 тысяч студэнтаў.
- **Георгій Кандрацьеў прызначаны выконваючым абавязкі галоўнага трэнера зборнай Беларусі па футболе.**
- Выстава работ маладых дызайнераў адзення адкрыецца ў Віцебску.

Экалогія

## Пластыкавы бруд: абмежаванні і кампенсацыя

Што рабіць, каб адходы не станавіліся ежай і не патануць у смецці

**Штогод кожны беларус стварае 400 кілаграмаў адходаў, толькі чвэрць з якіх адпраўляецца на перапрацоўку. Прычым большая частка смецця — гэта пластыкавыя пакеты, харчовая плёнка і іншыя віды ўпакоўкі. Калі чалавецтва не пачне змяншаць аб'ёмы выкарыстання пластыку, то да 2050 года ў акіяне яго будзе больш, чым рыбы, перакананы эксперты. Спецыялісты параілі, што рабіць кожнаму з нас для вырашэння пластыкавай праблемы, і расказалі, што прадпрымаецца ў Беларусі для змяншэння ўжывання пластыку.**

### Прынцыпы 7R

Пластыкавае забруджванне — праблема планетарнага маштабу. Сёлета нават Сусветны дзень абароны правоў спажыўца прайшоў пад дэвізам «Вырашыць праблему пластыкавага забруджвання планеты». Ужо, пэўна, усе вывучылі, што прадукты раскладання пластыку выдзяляюць шкодныя хімічныя рэчывы, якія могуць трапіць у глебу і грунтавыя воды (а ў Беларусі гэта адна з галоўных крыніц пітнога водазабеспячэння) і забрудзіць іх. А яшчэ з пластыку на палігонах выдзяляецца метан — адзін з асноўных парніковых газаў, які істотна спрыяе глабальнаму пацяпленню.

Акрамя таго, пластыкавыя адходы праз рэкі трапляюць у акіян, дзе пад уплывам ветру і сонца пераўтвараюцца ў мікрапластык. Яго прымаюць за планктон і праглынаюць марскія жыхары, а чалавек, у сваю чаргу, можа ўжыць пластык у ежу праз такія атручаныя морапрадукты. І хоць актыўна пластык выробляецца толькі прыкладна апошнія 15 гадоў, аднак шкода ад яго велізарная. Адна з прычын — тое, што 40 % пластыкавай упакоўкі выкідваюць адразу ж пасля першага выкарыстання, заўважылі эксперты.

Кампанія, распачатая да Сусветнага дня абароны правоў спажыўца, засяродзіцца сёлета на прынцыпах 7R:

*Rethink* — пераасэнсаванне мадэлі паводзін;
*Refuse* — адмаўленне ад непатрэбнай упакоўкі;
*Reduce* — змяншэнне выкарыстання, у тым ліку пластыку;
*Reuse* — другаснае выкарыстанне ўпакоўкі;
*Recycle* — перапрацоўка;
*Repair* — рамонт тавараў;
*Replace* — замена пластыку іншымі матэрыяламі.

СТАР. 3

# «Мінулы год стаў выпрабаваннем на трываласць не толькі ўлады, але і дыпламатычных кадраў»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён заўважыў, што сістэма органаў дыпламатычнай службы ні ў якім разе не павінна ператварыцца ў закасцянелую структуру, у якой працуюць тэарэтыкі, адарваныя ад жыцця. «У шэрагу краін наш шматгадовы вопыт сведчыць аб тым, што перспектывы беларускай дыпламатычнай прысутнасці там не праглядаюцца. Дык навошта нам захоўваць свае пасольствы, выдаткоўваць значныя бюджэтныя сродкі на іх утрыманне? Навошта там поўны штат дыпламатаў, якія адказваюць за пастаўленыя на паўзу напрамкі, калі мякка казаць? У такіх выпадках трэба працаваць на ўмовах узаемнасці, як гэта нядаўна было зроблена з Польшчай і Літвой», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў: у крайнім выпадку ўсе пытанні, якія цікавяць, можам абмяркоўваць на пляцоўках ААН і іншых міжнародных арганізацый у Нью-Ёрку, Жэневе або Вене. «Там ёсць магчымасць гаварыць з усім светам і няма неабходнасці трымаць палітычных дарадцаў у краінах, якія замарозілі з намі кантакты з прычыны сваёй прадузятасці або вядуць супраць нас дэструктыўную дзейнасць», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра стварэнне ў шэрагу дзяржаў тавараправодныя сеткі, што добра працуюць, і задаў у гэтым плане пытанні: ці ёсць неабходнасць дубліраваць іх сваімі гандлёвымі прадстаўнікамі ў пасольствах? Магчыма, эфектыўней гэтыя штатныя адзінкі перакінуць туды, дзе яны сапраўды будуць запатрабаваны для вырашэння актуальных задач?

Прэзідэнт паўтарыў галоўную ўмову стварэння новых устаноў за мяжой — адкрываць іх толькі за кошт пераразмеркавання рэсурсаў — не павінна быць ніякага раздзьмухвання штата.

Ён заявіў, што хоча пачуць адказы на наступныя пытанні: якія задачы мяркуецца вырашыць адкрыццём новых пасольстваў, якая будзе іх штатная колькасць і за кошт якіх рэзерваў яна сфарміруецца, якія падставы маюцца для закрыцця нашых прадстаўніцтваў у прапанаваных МЗС краінах?

«Ведаю, што ўрад, Адміністрацыя Прэзідэнта, КДБ і МЗС дэталёва прапрацоўвалі гэтыя пытанні. Пры абмеркаванні ўсіх пазначаных пытанняў важна ўлічваць перш за ўсё эканамічны аспект функцыянавання нашых пасольстваў і консульстваў. На падставе назапашанага вопыту і практыкі мы павінны вельмі выверана падысці да кожнай прапановы», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

## СУСЕДЗЯЎ НЕ ВЫБІРАЮЦЬ...

Другой часткай нарады стаў абмен думкамі па пытаннях знешняй палітыкі, асабліва ва ўзаемаадносінах з суседзямі, перадусім з Польшчай.

Па словах Прэзідэнта, палітычныя кантакты з гэтай краінай ніколі не былі ідэальнымі.

«Мы з прычыны свайго характару, менталітэту доўга мірыліся з асобнымі выпадамі, абвінавачваннямі ў свой адрас, спрабуючы знайсці кампраміс, праяўлялі гнуткасць, разуменне. Мы выходзілі з таго, што суседзяў не выбіраюць, і яны ўсе важныя для нас. Аказалася, што гэтыя канструктыўныя падыходы ў Варшаве ўспрымаюць як слабасць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён расказаў, як гатоўнасць польскага боку яшчэ летась у чэрвені ісці насустрач Беларусі ў шэрагу кірункаў змянілася «абвінавачваннямі ў фальсіфікацыі выбараў, падтрымкай збеглых, даваннем прыстанішча здраднікам, экстрэмістам і санкцыямі».

«У чэрвені яны нам спявалі песні прыемныя для слыху і ў той жа час праз спецслужбы і іншыя структуры ў палітыцы праводзілі двайную гульню. Апошняй кропляй, якая перапоўніла чашу цярпення, сталі неприкрытыя спробы гераізацыі бандытаў і ваенных злачынцаў, правядзенне з гэтай мэтай мерапрыемстваў для беларускай моладзі», — адзначыў кіраўнік краіны.

Па словах Прэзідэнта, рэакцыя праваахоўных органаў на супрацьпраўную дзейнасць грамадзян Беларусі, што называюць сябе палякамі, у Варшаве лічаць прыцісканнем польскай меншасці. «Чамусьці ў нас асобныя ўспамінаюць пра свае нацыянальныя карані, толькі калі пераступаюць закон, а не калі трэба зрабіць нешта карыснае для дзяржавы, грамадзянамі якой яны з'яўляюцца», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заявіў, што ў Беларусі заўсёды адказна падыходзілі да захавання правоў усіх нацыянальных меншасцяў і ганарацца міжэтнічным мірам у краіне. «Так яно будзе заўсёды. ***Рэлігійны і міжэтнічны мір у Беларусі будзе захаваны, чаго б гэта ні каштавала.*** Ніхто нас не штурхне ў супрацьборства палякаў з беларусамі ці рускімі. Больш за тое, з польскім народам беларусаў аб'ядноўвае шматвяковая гісторыя. У нас няма неўрэгуляваных тэрытарыяльных і маёмасных прэтэнзій адно да аднаго. ***Мы ніколі не ўспаміналі аб акупацыі Польшчай значнай часткі беларускай тэрыторыі ў 20—30-я гады мінулага стагоддзя. Але, мабыць, прыйшоў час вярнуцца да гэтай тэмы і дэталёва даследаваць яе з прыцягненнем гісторыкаў і палітолагаў.*** Гэта ўжо пачалі рабіць», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да кіраўніцтва Польшчы і падкрэсліў, што палякі, якія жывуць у Беларусі, — «нашы палякі і іх радзіма — Беларусь».

«Яны тут жылі, тут жывуць і будуць жыць іх дзеці. Хто хоча выехаць, мы нікога не трымалі і трымаць не збіраемся. Але тыя, хто жывуць у нас, грамадзяне Беларусі, — гэта нашы палякі, нашы рускія, нашы ўкраінцы і нашы яўрэі», — сцвярджае кіраўнік краіны.

Ён падкрэсліў, што хоча пачуць канкрэтныя прапановы па вяртанні паслядоўнай, актыўнай палітыкі ўзаемаадносін з Польшчай.

***«Мы не хочам ні з кім ваяваць, але калі да нас будуць такім чынам адносіцца (як тое было ў канцы мінулага года і зараз), то ў адказ атрымаюць, і вельмі моцна. Але і нам хопіць быць пасіўнымі назіральнікамі: там, дзе трэба рэагаваць, павінны рэагаваць адэкватна,*** як тое было ў Брэсце і Гродне (маюцца на ўвазе мерапрыемствы па гераізацыі ваенных злачынцаў. — **«Зв.»**)», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Наконт падзей у гэтых абласных цэнтрах ён заўважыў: адказнасць нясуць і мясцовыя ўлады, у якіх пад бокам разгарнулі дзейнасць дэструктыўныя сілы.

***«Даўно трэба было правесці праверкі курсаў вывучэння замежных моў, скаўцкіх арганізацый і іншых падобных ім структур, якімі кіруюць і якія фінансуюць*** з-за мяжы, — заявіў Прэзідэнт і даў заданне займацца гэтай праблемай Упаўнаважанаму па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. — Трэба прынцыпова разабрацца па ўсіх сумнеўных аб'яднаннях і ўстановах. Не толькі міжэтнічных і міжрэлігійных. У нас усякіх фондаў, структур, прадстаўніцтваў заходніх фондаў куча. Гэта справа кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта арганізаваць работу і ўсіх іх перарэгістраваць».

Паводле слоў кіраўніка краіны, нельга дапусціць, каб такія структуры ўцягвалі моладзь у антыдзяржаўную дзейнасць, садзейнічалі ўцечцы кадраў за мяжу.

«Неабходна папрацаваць на прадстаўленні грамадскасці і заходнім партнёрам так званага «польскага пытання». На Захадзе не ўсе разумеюць, што адбываецца на самай справе. Адпаведны план ужо рэалізоўваецца. Неабходна паскорыць гэту работу. Неабходна актыўней агучваць тэмы пераследу этнічных беларусаў у міжваенны і пасляваенны перыяды, дзейнасці польскіх нацыяналістычных бандфарміраванняў (і не толькі польскіх) на нашай тэрыторыі, рэваншысцкіх намераў кіраўнікоў гэтых дзяржаў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, афіцыйны Саюз палякаў у Беларусі павінен канструктыўна працаваць на дабрабыт краіны і садзейнічаць узмацненню адносін.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ У ТЭМУ

Мінулая аптымізацыя замежных устаноў была ў 2017—2018 гадах. З таго перыяду адбылося шмат падзей, таму і з'явілася неабходнасць перагляду канцэпцыі дзейнасці замежных прадстаўніцтваў. Пра гэта паведаміў пасля нарады журналістам **міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ.**

«Мы дасканала вывучылі гэтае пытанне, зыходзячы з тых патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да знешнепалітычнага ведамства. І ўнеслі на разгляд урада і Адміністрацыі Прэзідэнта адпаведныя прапановы, — сказаў ён. — Мы зыходзілі з узроўню развіцця знешнеэканамічных адносін з краінамі, з узроўню тавараабароту, з аб'ёму нашага экспарту ў пэўную краіну. Не хачу сказаць, што мы закрыем 10 пасольстваў і адразу адкрыем 10 новых, такога не будзе. Рухацца будзем паступальна».

Канкрэтныя краіны, дзе пасольствы будуць закрытыя, Уладзімір Макей не назваў, але такіх будзе некалькі. Прычына простая — іх дзейнасць не прыносіць знешнеэканамічнай аддачы. За кошт свабодных рэсурсаў і кадраў увагу нададуць пашырэнню дыппрысутнасці ў перспектыўных рэгіёнах.

«Напрыклад, актыўна развіваюцца адносіны з Зімбабвэ: і палітычныя, і гандлёва-эканамічныя. Чаму б не паглядзець на гэту краіну? — падзяліўся міністр. — Калі ўзяць В'етнам і Індыю, то фінансава-эканамічныя сталіцы (Хашымін, Мумбаі) гэтых краін знаходзяцца на адлегласці 1500 кіламетраў ад рэальных сталіц. На наш погляд, мэтазгодна непасрэдна там дыпламатычна прысутнічаць беларускаму боку. Таму ёсць сэнс размясціць наша генеральнае консульства. Калі ўзяць Ганконг, таксама няма нашага прадстаўніцтва, але гэта перспектыўны рэгіён і рынак».

Уладзімір Макей расказаў, што раз на тры гады ў часы летняй вучобы для кіраўнікоў замежных устаноў Беларусі праводзілі сустрэчу з Прэзідэнтам. Такую нараду вырашылі правесці і сёлета.

Наконт адносін з Польшчай міністр адзначыў, што не беларускі бок быў ініцыятарам абвастрэння адносін. «Нягледзячы на нашы запыты, звязаныя з дэструктыўнай дзейнасцю шэрагу асоб, якія знаходзяцца на тэрыторыі Польшчы і некаторых прыбалтыйскіх краін, мы не атрымалі канструктыўнага адказу. Таму мы былі вымушаны пайсці на рэзкія крокі, звязаныя з высылкай дыпламатаў», — дадаў Уладзімір Макей.

Па яго словах, крымінальныя справы, заведзеныя на асобных грамадзян Беларусі з-за мерапрыемстваў, якія праслаўляюць «праклятых салдат», маюць канкрэтныя прычыны. «Нашы партнёры спрабуюць прадставіць гэта ў некаторых міжнародных арганізацыях, на знешнім контуры як ціск на польскую меншасць у Беларусі, што абсалютна не адпавядае рэчаіснасці. Мы поўнасцю выконваем нашы міжнародныя абавязкі ў гэтай сферы. Больш за тое, сёння кіраўнік краіны падкрэсліў, што ні ў якім разе гэтыя абавязкі не будуць парушаны», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

Ён заявіў, што Прэзідэнту былі прадстаўлены і ім падтрыманы меры па развіцці адносін з нашымі суседзямі. «Мы зацікаўлены ў развіцці і гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння. Мы зацікаўлены, і сёння абмяркоўвалася пытанне аб магчымым вяртанні паслоў нашых краін (маюцца на ўвазе Беларусь і Польшча. — **«Зв.»**). Але для гэтага павінны быць сур'ёзныя падставы, якія дазволяць спадзявацца на больш спакойнае развіццё сітуацыі», — паведаміў кіраўнік МЗС.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Технолит Полоцк», 211408, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101** |

| № лота | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Оборудование и транспортные средства, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101** | | | | |
| 1 | 1276 | Вибролоток суточных бункеров | 1 080,00 | 54,00 |
| 2 | 2337 | Кокильный комплекс для производства отливок из чугуна | 312 600,00 | 15 630,00 |
| 3 | 2338 | Линия розлива кокильного литья | 1 920,00 | 96,00 |
| 4 | 585 | Машина формовочная | 5 400,00 | 270,00 |
| 5 | 762 | Смеситель центробежный | 10 200,00 | 510,00 |
| 6 | 2333 | Смеситель периодического действия | 104 880,00 | 5 244,00 |
| 7 | 207 | Поперечно-строгальный станок 7Д36 | 3 960,00 | 198,00 |
| 8 | 216 | Пресс для запрессовки подшипников (нест.) | 468,00 | 23,40 |
| 9 | 304 | Станок вертикально-сверлильный 2А135 | 2 160,00 | 108,00 |
| 10 | 342 | Станок вертикально-сверлильный 2С-132 | 2 640,00 | 132,00 |
| 11 | 356 | Станок фрезерный 6Р82Ц | 3 000,00 | 150,00 |
| 12 | 358 | Станок обдирочно-шлифовальный 3М634 | 396,00 | 19,80 |
| 13 | 385 | Станок универсальный заточной 3Д642Е | 2 640,00 | 132,00 |
| 14 | 392 | Плоско-шлифовальный станок ОШ 40-80 | 7 200,00 | 360,00 |
| 15 | 423 | Станок круглопильный Ц6-2 | 3 840,00 | 192,00 |
| 16 | 432 | Вальцы резинообрабатывающие ПД-320 160/160 | 6 000,00 | 300,00 |
| 17 | 468 | Вертикально-сверлильный станок 2Н135 | 2 280,00 | 114,00 |
| 18 | 434 | Зарядно-пусковое устройство DecaClassBooster 400E | 360,00 | 18,00 |
| 19 | 561 | Пресс-ножницы (нест.) | 4 680,00 | 234,00 |
| 20 | 735 | Станок универсально-заточной 3Д642Е | 2 640,00 | 132,00 |
| 21 | 798 | Радиально-сверлильный станок 2К 52-2 | 5 640,00 | 282,00 |
| 22 | 822 | Пресс кривошипный К2318А | 3 480,00 | 174,00 |
| 23 | 999 | Пресс кривошипный КД 2124Е | 6 120,00 | 306,00 |
| 24 | 1107 | Станок обдирочно-шлифовальный 3Б634 | 840,00 | 42,00 |
| 25 | 1136 | Станок обдирочно-шлифовальный 3Б634 | 768,00 | 38,40 |
| 26 | 1138 | Станок заточной универсальный 3В642 | 2 400,00 | 120,00 |
| 27 | 1143 | Станок обдирочно-шлифовальный 3Б634 | 768,00 | 38,40 |
| 28 | 1201 | Станок универсальный фрезерный 675П | 3 600,00 | 180,00 |
| 29 | 1210 | Станок долбежный 7А420 | 4 080,00 | 204,00 |
| 30 | 1219 | Ножницы листовые НД 3316Г | 5 760,00 | 288,00 |
| 31 | 1220а | Полуавтомат зубофрезерный 5Е32 | 5 280,00 | 264,00 |
| 32 | 1238 | Печь камерная СНО-7.6, 3.1/6-И1 | 2 520,00 | 126,00 |
| 33 | 1250 | Электроталь Т10432 2 т | 2 640,00 | 132,00 |
| 34 | 1296 | Станок абразивно-отрезной | 864,00 | 43,20 |
| 35 | 1368 | Обдирочно-шлифовальный станок 3М636 | 1 800,00 | 90,00 |
| 36 | 1476а | Пресс гидравлический П-6326 | 5 760,00 | 288,00 |
| 37 | 1628 | Окрасочный агрегат «Меркур» 030. 050 | 4 440,00 | 222,00 |
| 38 | 1718 | Пылесос В19-101 | 1 920,00 | 96,00 |
| 39 | 1719 | Пылесос В19-101 | 1 920,00 | 96,00 |
| 40 | 1730 | Аппарат для воздушно-плазменной резки «Мультиплаз – 15000» | 5 880,00 | 294,00 |
| 41 | 4740 | Бесшумная ротационная компрессорная установка CSC-40/8 в сборе с осушителем | 29 520,00 | 1476,00 |
| 42 | 4780 | Мойка высокого давления с фильтром для очистки воды Stihl RE 521 | 1 440,00 | 72,00 |
| 43 | 1920 | ПерфобиндерCobbind C 20 | 156,00 | 7,80 |
| 44 | 1972а | Станок горизонтально-фрезерный | 2 640,00 | 132,00 |
| 45 | 2247 | Станок радиально-сверлильный 2К 52-1 | 5 160,00 | 258,00 |
| 46 | 2269 | Станок настольно-сверлильный 2М112 | 612,00 | 30,60 |
| 47 | 2341 | Станок радиально-сверлильный 2К 52-1 | 5 160,00 | 258,00 |
| 48 | 2531 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 2 400,00 | 120,00 |
| 49 | 2546 | Станок универсально-заточной 3Д642 | 4 440,00 | 222,00 |
| 50 | 2651 | Пылеотсос ПА 218Б | 1 200,00 | 60,00 |
| 51 | 2653 | Пылеотсос ПА 218Б | 1 200,00 | 60,00 |
| 52 | 2656 | Пылеотсос ПА 218 | 1 116,00 | 55,80 |
| 53 | 3034 | Станок обдирочно-шлифовальный 3К-633 | 384,00 | 19,20 |
| 54 | 3444 | Станок радиально-сверлильный 2К 52-2 | 5 640,00 | 282,00 |
| 55 | 3498 | Станок настольно-сверлильный ОС-15 | 660,00 | 33,00 |
| 56 | 3570 | Пылеотсос В19-101 | 1 440,00 | 72,00 |
| 57 | 3573 | Пылеотсос В19-101 | 1 440,00 | 72,00 |
| 58 | 3634 | Печь термической закалки мелких партий деталей (нест.) | 2 640,00 | 132,00 |
| 59 | 3751 | Станок настольно-сверлильный ОС-15 | 660,00 | 33,00 |
| 60 | 3813 | Станок вертикально-сверлильный МН-25-Н | 2 520,00 | 126,00 |
| 61 | 1134 | Станок заточной 36922 | 768,00 | 38,40 |
| 62 | 970 | Пресс гидравлический П-6324 | 3 720,00 | 186,00 |
| 63 | 4529 | Полуавтомат сварочный ПДГ-508М | 3 120,00 | 156,00 |
| 64 | 204 | Электросети кабельные | 34 440,00 | 1722,00 |
| **Оборудование, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, пр-д Октябрьский, 2** | | | | |
| 65 | 449 | Кран-балка г/п 3 т | 3 960,00 | 198,00 |
| 66 | 162 | Кран-балка г/п 2 т | 3 000,00 | 150,00 |
| 67 | 46 | Кран-балка г/п 3 т | 3 960,00 | 198,00 |
| 68 | 2461 | Кран-укосина ОПТ-1153 г/п 0,5 т | 3 600,00 | 180,00 |
| 69 | 1359 | Электротельфер г/п 0,5 т | 2 040,00 | 102,00 |
| 70 | 570 | Электроталь г/п 3,2 т | 3 360,00 | 168,00 |
| 71 | 1658 | Таль электрическая Т-10332 г/п 1 т | 2 760,00 | 138,00 |
| 72 | 1242 | Электроталь Т-10432 г/п 2 т | 2 760,00 | 138,00 |
| 73 | 244 | Электротельфер г/п 3 т | 3 120,00 | 156,00 |
| 74 | 965 | Силовое электротехническое оборудование и распределительные устройства | 51 686,40 | 2 584,32 |
| **Оборудование, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47** | | | | |
| 75 | 373 | Испытательный стенд абразивных кругов СИП-800 | 3 720,00 | 186,00 |
| 76 | 1324 | Станок токарный по дереву ТВ-200М | 1 800,00 | 90,00 |

**Капитальные строения в следующем составе:**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 77 | **Здание трансформаторной подстанции № 4** (здание специализированное энергетики), инв. номер 250/С-29027, общая площадь 89,5 кв. м. **В состав лота входит:** секция шин РУ-10 кВ с КСО-272, секция шин РУ-0,4 кВ с автоматом APU-50, автомат нагрузки А3144, трансформатор силовой ТМ-1000/10, линия электропередачи кабельной напряжением до 10 кВ | 129 860,40 | 6 493,02 |
| **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,0156 га для использования под производственную базу. | | | |
| 78 | Автостоянка (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. номер 250/С-39504, общ. пл. 3130 кв. м. Составные части и принадлежности: площадка, эстакада | 67 800,00 | 3 390,00 |
| **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,3999 га для размещения автостоянки | | | |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Крыленко Николай Николаевич, 8029-590-87-81

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (от 1 % до 10 %) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **12.05.2021 в 13.00 по адресу: ОАО «Технолит Полоцк», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101, 2-й этаж, актовый зал** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **07.05.2021до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |



## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Буда-Кошелевский КБО»** (УНН 400035136) 247355, Гомельская обл., г. Буда-Кошелева, ул. Головачева, 10, тел./факс: +375 232 31-59-72/25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **19 апреля 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль IZH 27175, VIN: Z9Z271750C0033294, рег. № AI 3926-3, тип ТС – грузовой фургон, тип двигателя – бензиновый, 6-ст. МКПП, колесная формула 4x2, 2012 г. в. | 3500,00 |
| 2 | Одежда мужская, женская, детская в ассортименте (201 наименование в количестве 379 ед.) | 2343,00 |
| 3 | Носилки для сушки бетонных форм (80 шт.) *(2,5 м – 10 шт., 2,0 м – 70 шт.)* | 277,20 |
| 4 | Газовые баллоны (50 л), 2 шт. | 33,60 |
| 5 | Спортивный инвентарь в ассортименте (79 ед.) – ботинки лыжные, лыжи, лыжные палки *(ботинки лыжные – 23 пары, беговые лыжи – 33 пары, лыжные палки – 23 пары)* | 970,20 |
| 6 | Сейфы металлические в ассортименте (5 шт.) *(2-секц. – 2 шт., 1-секц. с вентилем – 2 шт., 1-секц. – 1 шт.)* | 252,00 |
| 7 | Комплект оборудования и мебели № 1 (5 ед.) | 8586,00 |
| 8 | Комплект оборудования и мебели № 2 (5 ед.) | 6606,00 |
| 9 | Комплект мебели (комплект для организации рабочего места приемщика, инв. № 550, 2010 г. в. Рабочее место приемщика, инв. № 501, 2009 г. в.) | 4230,00 |
| 10 | Комплект оборудования по ремонту швейных изделий, инв. № 555, 2008 г. в. | 1530,00 |
| 11 | Холодильник МХМ-2835 ЗАО «Атлант», инв. № б/н, 2011 г. в. | 207,00 |
| 12 | Швейная машина «Орша» 22 кл 141267, инв. № 00022, 1989 г. в. | 45,00 |
| 13 | Швейная машина «Орша» 22 кл 080652, инв. № 00086, 1982 г. в. | 45,00 |
| 14 | Швейная машина «Орша» 22 кл 390542, инв. № 00065, 1979 г. в. | 45,00 |
| 15 | ПМШ ORSHA 457364, инв. № 00084, 2007 г. в. | 45,00 |
| 16 | Швейная машина ORSHA 22 кл 454977, инв. № 012109, 1979 г. в. | 45,00 |
| 17 | Петельная машина 25 кл Minerva 19724, инв. № 00018, 1989 г. в. | 990,00 |
| 18 | ПШМ ORSHA 455036, инв. № 042110, 2006 г. в. | 45,00 |
| 19 | Петельная ШМ 090900251, инв. № 860, 2010 г. в. | 1080,00 |
| 20 | Петельная швейная машина CHNKI, инв. № 012129, 2007 г. в. | 1440,00 |
| 21 | Петельная швейная машина CHNKI, инв. № 012111, 2008 г. в. | 1440,00 |
| 22 | Скорняжная машина ZOJE ZJ202, инв. № 00372, 2007 г. в. | 423,00 |
| 23 | Гладильная машина «ЯНИНА-М», инв. № б/н, 2010 г. в. | 126,00 |
| 24 | Профессиональный гладильный каток Electrolux IC43316, инв. № 997032, 2007 г. в. | 10980,00 |
| 25 | Сушуар, инв. № 509, 2008 г. в. | 153,00 |
| 26 | Швейная машина ORSHA 22 кл., инв. № б/н, 2011 г. в. | 81,00 |
| 27 | Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, инв. № б/н, 2011 г. в. | 1800,00 |
| 28 | Комплект оборудования для организации рабочего места приемщика, инв. № б/н, 2011 г. в. | 2340,00 |
| 29 | Комплект оборудования для организации рабочего места по ремонту швейных изделий, инв. № б/н, 2011 г. в. | 900,00 |
| 30 | Сушуар, инв. № 851, 2008 г. в. | 171,00 |
| 31 | Комплект оборудования рабочего места обувщика, инв. № б/н, 2008 г. в. | 2790,00 |
| 32 | Бетоносместитель БС-270В, инв. № б/н, 2011 г. в. | 990,00 |
| 33 | Формы литейные для изготовления железобетонных изделий в ассортименте (49 ед.) | 12987,00 |

**Местонахождение: п. 1 – г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77; п. 2 – г. Гомель, ул. Катунина, 14; п. 3-4, 26-33 – г. Буда-Кошелево, ул. 50 лет Октября, 28; п. 5–6, 9–19 – г. Буда-Кошелево, ул. Головачева, 10; п. 7 – н.п. Рогинь, Буда-Кошелевского р-на; п. 8 – н.п. Николаевка, Буда-Кошелевского р-на; п. 20–25 – г. Гомель, ул. Федосеенко, 4. Телефон для ознакомления и осмотра, +375 29 135-78-72.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 08.04.2021 г. 09.00 по 16.04.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 30.01.2021 г.



## ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже права заключения договора аренды нежилого помещения в городе Гродно 4 мая 2021 года

| № лота | Местонахождение объекта | Площадь, кв. м | Начальная цена, руб. | Наименование объекта |
|---|---|---|---|---|
| **Балансодержатель: Гродненский областной комитет природных ресурсов и охраны окружающей среды. Адрес: г. Гродно, ул. Советская, 23. Тел. 8 0152 62-01-54** | | | | |
| 1 | г. Гродно, ул. Советская, 23 | 186,2 | 787,63 | Часть капитального строения, инв. № 400/С-2520 (здание административное № 23) |

Договор аренды заключается сроком на 3 (три) года.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом самостоятельно, по договоренности с балансодержателем помещения, указанным в данном извещении.

**Аукцион состоится 4 мая 2021 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 117 в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 5 апреля по 28 апреля 2021 года.**

Телефоны для дополнительной информации об аукционе в Гродно: (0152) 62-60-55, 62-60-56. Извещение о проведении аукциона опубликовано на сайтах: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь https://au.nca.by (аукцион ID 5340), Гродненского городского исполнительного комитета http://www.grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

УНП 590727594



## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Лоевский КБО»** (УНН 400028996) 247095, Гомельская обл., г.п. Лоев, ул. Ленина, 24а, Тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **19 апреля 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль IZH 27175, VIN: Z9Z271750C0033764, рег. № AI 4595-3, тип ТС – грузовой фургон, тип двигателя – бензиновый, 6-ст. МКПП, колесная формула 4x2, 2012 г. в., г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77 | 3780,00 |
| 2 | Капитальное строение, инв. № 340/С-314434, площадь – 471,6 кв. м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание столярного цеха. Кадастровый номер земельного участка, на котором расположено капитальное строение, – 323055100001002852. Местонахождение: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59А | 9620,00 |
| 3 | Капитальное строение, инв. № 340/С-314435, площадь – 41,5 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада сырья и материалов. Кадастровый номер земельного участка, на котором расположено капитальное строение, – 323055100001002852. Местонахождение: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59А/1 | 800,00 |
| 4 | 1. Капитальное строение, инв. № 340/С-315568, площадь – 127,0 кв. м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание пилорамы. Кадастровый номер земельного участка, на котором расположено капитальное строение – 323055100001002852. Местонахождение: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59А/2. 2. Пилорама Р63. Оборудование конвейера в комплекте к раме РПМО-02М, 2005 (2013) г. в., инв. № 2278. 3. Заточной станок, г. в. н/у, инв. № б/н | 15228,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. № 340/С-313948 общей площадью 140,9 кв. м, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание комплексно-приемного пункта. Составные части и принадлежности: терраса, крыльцо. Кадастровый номер земельного участка, на котором расположено капитальное строение: 323080401110100165. Местонахождение: Гомельская обл., Лоевский р-н, Бывальковский с/с, д. Бывальки, ул. Ермакова Ф.А., 17. | 8900,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 08.04.2021 г. 09.00 по 16.04.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 30.01.2021 г.



## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении 04/05/2021 повторного открытого аукциона

Лот № 1: **Капитальное строение с инв. № 736/С-5673 – гараж**, общ. пл. (кв. м): 351,9. **Капитальное строение с инв. № 736/С-5670 – гараж,** общ. пл. (кв. м): 584,5. **Капитальное строение с инв. № 736/С-5675 – склад запчастей,** общ. пл. (кв. м): 188,7. **Капитальное строение с инв. № 736/С-5669 – здание бытовое,** общ. пл. (кв. м): 37,3. **Капитальное строение с инв. № 736/С-5668 – контора лесопиления,** общ. пл. (кв. м): 38,3. **Капитальное строение с инв. № 736/С-5672 – столярный цех,** общ. пл. (кв. м): 100,3. **Капитальное строение с инв. № 736/С-5690 – цех под пилораму,** общ. пл. (кв. м): 350. **Капитальное строение с инв. № 736/С-5671 – котельная**, общ. пл. (кв. м): 159,2. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., Чериковский р-н, Вепринский с/с, д. Гронов, ул. Набережная, 101, 101/1, 101/2, 101/3, 101/5, 101/6, 101/7, 101/8, на земельном участке с кадастровым № 725680402101000073, пл. (га): 6,9764.

***Начальная цена продажи: 161 168,70 бел. руб. с учетом НДС.***

Лот № 2: **Капитальное строение с инв. № 736/С-5688 – медпункт**, общ. пл. (кв. м): 140, расположено по адресу: Могилевская обл., Чериковский р-н, Вепринский с/с, д. Гронов, ул. Лесная, 3. На земельном участке с кадастровым № 725680402101000140, пл. (га): 0,1050.

***Начальная цена продажи: 18 912,00 бел. руб. с учетом НДС.***

Лот № 3: **Капитальное строение с инв. № 736/С-5689 – здание конторы**, общ. пл. (кв. м): 369,4 расположено по адресу: Могилевская обл., Чериковский р-н, Вепринский с/с, д. Гронов, ул. Лесная, 1. На земельном участке с кадастровым № 725680402101000141, пл. (га): 0,1096.

***Начальная цена продажи: 37 528,85 бел. руб. с учетом НДС.***

**Аукцион состоится 04 мая 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by. Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 19.11.20.

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

# ПЯЦІ ВОІНАМ І ДВУМ НЕВЯДОМЫМ САЛДАТАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вядома, час і прырода разбураюць надмагіллі, але многія з іх цяперашняе пакаленне аднаўляе. Усё часцей ставяць новы памятны знак побач са старым, аддаючы даніну пашаны папярэднікам. Падобны прыклад давялося ўбачыць і падчас апошняй камандзіроўкі ў Кобрынскім раёне.

Недалёка ад вёскі Корчыцы ўстаноўлены знак на месцы гібелі сям'і Загрэбаў. Там расстралялі сем чалавек. Расказвае настаўніца Хідрынскай школы Ірына Назарук:

— У Загрэбаў, як і ў большасці вяскоўцаў, была вялікая сям'я, у адной хаце жылі тады некалькі яе пакаленняў. Гэтыя людзі дапамагалі партызанам, і нехта ж выдаў, казалі, што вясковы стараста. 15 лютага 1943 года ў цэнтры вёскі каля крыжа сабралі ўсіх жыхароў. Людзям загадалі ісці ў будынак школы на сход. Там аб'явілі, што сям'я Загрэбаў і Надзея Нікіцюк будуць пакараныя за сувязь з партызанамі. Усім загадалі выйсці, а названым было сказана заставацца. Людзі выйшлі і чакалі побач. Калі выводзілі асуджаных на смерць, адзін з немцаў, што аказаўся чалавекам, выпхнуў хлопчыка Мішу ў натоўп. Канвойны прапаноўваў таксама ратавацца і 12-гадовай дзяўчынцы, але маці не адпусціла ад сябе дачку. Людзі вырашылі потым, што яна пабаялася, каб немцы ці паліцаі не паздзекаваліся з дзяўчынкі, і выбрала смерць... Такім чынам, з сям'і выратаваліся два хлопчыкі: Міша і ягоны брат Павел, які быў у бабулі. А вось маці сям'і і бабулю Аксеню, яе дарослых сына і дачок, іх дзяцей, у тым ліку трохгадовую Кацярыну, іх 19-гадовую суседку Надзею расстралялі...



Старшыня Олтушскага сельсавета Вітольд ПЯТКЕВІЧ каля помніка ў вёсцы Хмелішча.

Людзям загадалі разыходзіцца, але яны з вокан бачылі, як вялі асуджаных. 32-гадовая Ганна была на дзявятым месяцы цяжарнасці, ёй было цяжка ісці, яна раз-пораз нахілялася і брала ў рот снег. А калі яна ўжо ляжала расстраляная, малое яшчэ доўга варушылася ўнутры мёртвай маці. Як вядома, 15 лютага — Грамніцы, быў даволі халодны дзень, але як толькі іх расстралялі, раптам пайшоў дождж. Усе ўспрынялі гэта як знак, нябёсы плакалі па нявінных ахвярах.

Спачатку на тым месцы ўзвышаўся крыж, пастаўлены сваякамі забітых. Сціплы абеліск з зорачкай паставілі недзе на рубяжы 60—70-х гадоў. Яго падтрымлівалі, рамантавалі, але ён стаў разбурацца, і ў пачатку 2000-х намаганнямі раённай улады ўстанавілі мармуровую пліту з імёнамі і прозвішчамі расстраляных, паднавілі і стары помнік. Цяпер яго даглядаюць вучні мясцовай школы, сельвыканкам, прадстаўнікі грамадскасці.

## Абеліскі каля вёсак Арол і Ор

У суседнім з Хідрынскім, Кісялевіцкім сельсавеце, такіх помнікаў таксама нямала. Адзін з іх стаіць у полі, акружаным лясамі, у памяць аб спаленай вёсцы. Некалі на беразе Дняпроўска-Бугскага канала стаяла зусім невялікая вёсачка з назвай Арол. Яе ўтварылі былыя хутаране, якіх аб'ядналі ў паселішча. Людзі сеялі хлеб, гадавалі дзяцей. Побач праходзіла чыгунка, на якой у вайну партызаны не раз праводзілі паспяховыя дыверсіі. За гэта і знішчылі акупанты ўвесь Арол. 22 снежня 1943 года жыхароў сагналі ў крайнюю хату Івана Хамука, закідалі гранатамі і спалілі. Потым падпалілі ўсе астатнія хаты.

Пасля вызвалення астанкі 27 чалавек, якія загінулі ў агні, былі пахаваныя на пагорку ў брацкай магіле. Вёска больш не адрадзілася. Сёння пра трагедыю нагадвае помнік-валун з мемарыяльнай шыльдай. Сёлета 20 сакавіка вучні і настаўнікі Кісялевіцкай школы правялі тут памятнае мерапрыемства, усклалі кветкі, згадалі ахвяр вайны. Старшыня Кісялевіцкага сельскага Савета Іван Будзько сказаў, што на месца трагедыі Арла прыходзяць вясной прыбраць, а кветкі прыносяць 9 Мая, на Радаўніцу, у дзень знішчэння вёскі.

А ў вёсцы Балата гэтага сельсавета некалі вясковая грамада самастойна ўвекавечыла памяць абаронца Радзімы. Малады афіцэр Мікалай Сілаў загінуў у баях пры вызваленні. Цела яго з дакументамі знайшлі на полі і пахавалі па-людску на вясковых могілках, паставілі сціплы помнік. З часам ён амаль зусім разбурыўся. І летась за сродкі сельвыканкама зрабілі новы помнік 26-гадоваму лейтэнанту з Падмаскоўя, які назаўсёды застаўся ў беларускай вёсцы Балата.

Адсюль, калі паехаць па дзвінскай трасе на поўдзень, то і двух дзясяткаў кіламетраў не будзе да вёскі Ор. Ва ўрочышчы Ор у глыбіні лесу таксама ўстаноўлены помнік на брацкай магіле. Тут пахаваныя салдаты, афіцэры, партызаны, якія загінулі ў 1944-м, пры вызваленні. Мясцовыя жыхары расказвалі, што пахаванні пачаліся яшчэ летам 1941 года, калі ў вёску зайшлі немцы. Акупанты знайшлі некалькі чырвонаармейцаў-акружэнцаў і расстралялі. Потым тут хавалі партызан, якія гінулі ў перастрэлках. У 1944-м былі асабліва жорсткія баі, страты неслі абодва бакі. Немцы хавалі сваіх на ўзгорку, у іх яшчэ ваявалі мадзьяры, румыны, харваты. Вясной, як раставаў снег, мясцовыя жыхары знаходзілі трупы людзей і асабліва не разбіраліся, свой ці чужы — закопвалі на месцы, ведалі: Богам залічыцца. Пасля вайны было перапахаванне. Дзе помнілі — адкапалі. Звезлі ў адно месца, так з'явілася брацкая магіла. Пазней паставілі абеліск. Яго даглядала не адно пакаленне школьнікаў. Пасля таго як школы паблізу пазакрывалі, помнік і прылеглую тэрыторыю трымае ў парадку лясніцтва пры падтрымцы мясцовай улады.

## Расстрэльны дзень

У суседнім Маларыцкім раёне такіх помнікаў многа. Напрыклад, Хмелішча згубілася далёка ў лясах. Нават паказальнік, які стаіць на трасе каля вёскі Навалессе з адзнакай «3», у сэнсе тры кіламетры, падманвае падарожніка. Аказалася, тут не тры, а нават крыху больш за пяць кіламетраў па лесе: засякалі на спідометры. І дарога асаблівая, расказваў старшыня Олтушскага сельскага Савета Вітольд Пяткевіч.

Гэта памежная зона, ехаць можна, спыняцца машынай на дарозе нельга. Да ўкраінскай граніцы ад помніка загінулым жыхарам Хмелішча менш за кіламетр.

Жыхар вёскі Сцяпан Чуль расказваў трагічную гісторыю вёскі, якую пачуў ад сваіх бацькоў, бабуль-дзядуляў. Гаварылі, што фармальнай падставай для экзекуцыі стаў нейкі дзівак у зямлянцы, які жыў там даўно: «Ніякі ён не партызан, так, дробны зладзюжка і гультай, які сядзеў у лесе». А немцы яго знайшлі і паставілі ў віну насельніцтву вёскі, што не данеслі пра нелегала акупацыйным уладам. За гэтым ішло пакаранне: усе, старыя і малыя — падлягалі знішчэнню, за выключэннем тых сем'яў, чые дзеці былі вывезены на прымусовыя работы ў Германію. Пра расстрэльны дзень у Хмелішчы ёсць звесткі ў кнізе «Злачынствы нямецка-фашысцкіх акупантаў у Беларусі», там прыводзіцца справаздача капітана Пельса, што праводзіў аперацыю: «Расстраляна 28 мужчын, 40 жанчын, 60 дзяцей. Спалены 21 сялянскі двор. Кампанія была скончана без інцыдэнтаў у 23.00».

Помнік паставілі яшчэ ў 70-х гадах. Зараз яго даглядаюць і падтрымліваюць усёй грамадой. А вось гісторыя помніка за вёскай Субаты гэтага раёна падалася мне асабліва шчымлівай. Яго многія гады даглядала жыхарка вёскі Надзея Вакульская. Там пахавана амаль палова яе сям'і. Ад Надзеі Іосіфаўны і ведалі землякі гісторыю той фашысцкай «прафілактыкі». Вёска знаходзілася ў лесе, таму па вызначэнні была пад падазрэннем у сувязях з партызанамі. Праверыць вырашылі асаблівым чынам. Прыехаў карны атрад. Выводзілі з кожнай хаты сям'ю, звяралі са спісам. Калі дома не аказвалася некага з мужчын, лічылася, што ён у партызанах. Такія сем'і вывелі ў лес і расстралялі. Помнік на тым месцы паставілі самі жыхары, пазней намаганнямі мясцовай улады прымацавалі таблічку. Мне гэтую гісторыю расказала Вольга Букач. На вялікай брацкай магіле растуць шматгадовыя кветкі. Іх пасадзіла яшчэ Надзея Вакульская, яе ўжо пяць гадоў як няма, а помнік даглядае Чарнянскі сельвыканкам.

Летась у дадатку «Мясцовае самакіраванне» расказвалася гісторыя, што адбылася ў вёсцы Павіцце Кобрынскага раёна. Адзін падарожнік, які аказаўся расійскім бізнесменам, убачыў у лесе помнік. Яго вельмі ўразіла, што сціплы абеліск за пяць кіламетраў ад населенага пункта не закінуты і не зарослы бур'янам, а дагледжаны і добраўпарадкаваны. Выпадковы госць захацеў неяк адзначыць нераўнадушных людзей. У выніку сельскі Дом культуры атрымаў спонсарскую дапамогу на новае ўбранне для сцэны. Не ведаю, які канкрэтна помнік убачыў наш герой, можа, адзін з тых, што знаходзіцца ў маім архіве з камандзіровак. Ужо і згадаць не магу, у якім раёне быў зроблены здымак. Помнік вельмі стары, на абеліску, што стаіць паміж дзвюма велізарнымі соснамі, пералічаны пяць прозвішчаў ахвяр фашызму «Захарчанка, Кузьмін, Валуевіч, Рабцэвіч, Рабцэвіч і два невядомыя салдаты». У глыбіні лесу нехта знайшоў целы, пахаваў і ўвекавечыў. Пазней паставілі агароджу, хтосьці даглядае і падфарбоўвае літары. Значыць, памяць жыве.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Кобрынскі, Маларыцкі раёны.*

# ЭНЕРГІЯ ІНВЕСТЫЦЫЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адзін з перспектыўных кірункаў — развіццё «зялёнай» энергетыкі. Яшчэ ў 2014 годзе ў рамках Дэкрэта № 10 быў заключаны інвестдагавор з міжнароднай энергетычнай кампаніяй «Інтэррыджынал Энэрджы Кампані ГмбХ», якая пабудавала ў Касцюковічах на плошчы каля 8,5 гектара фотаэлектрычную станцыю агульнай магутнасцю 4,5 МВт. Яна знаходзіцца якраз паміж Беларускім цэментным заводам і горадам. Для вытворчасці сонечнай электраэнергіі выкарыстоўваецца абсталяванне ад вядучых еўрапейскіх кампаній.

— На забруджаных землях, якія непрыдатныя для вырошчвання сельскагаспадарчых культур, такія станцыі прыносяць сапраўдную карысць, — адзначае **начальнік камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Дзмітрый МУДРАГЕЛАЎ.** — Яны дапамагаюць задзейнічаць гэтыя землі ў абароце. Плюс інвестыцыі і стварэнне новых рабочых месцаў.

Першы ўчастак касцюковіцкай фотаэлектрычнай станцыі быў уведзены ў 2016-м. У снежні 2018-га яна запрацавала на поўную магутнасць. Яе, вядома, не параўнаць з чэрыкаўскай, якая лічыцца самай буйной у краіне. Але ж карысць ад яе сапраўды адчувальная. Створаны сем працоўных месцаў, прыцягнута інвестыцый на суму звыш 11 мільёнаў рублёў, а агульнарэспубліканская электрычная сетка папаўняецца энергіяй ад сонца. У вясенне-летні перыяд станцыя выпрацоўвае каля 450 тысяч кілават электрычнай энергіі, восенню ў сярэднім 150 тысяч, зімой — 50 тысяч. Летам, у перыяд найбольш высокай сонечнай актыўнасці, станцыя забяспечвае раён электраэнергіяй у аб'ёме 2,3 % ад агульнай патрэбы ў месяц.

**Васіль СЫРВАЧОЎ, начальнік фотаэлектрычнай станцыі,** адзін з тых маладых людзей, якія працуюць на карысць сваёй малой радзімы. Ён выпускнік магілёўскага Беларуска-Расійскага ўніверсітэта, пасля ВНУ вярнуўся ў Касцюковічы на Беларускі цэментны завод, працаваў на газатурбіннай устаноўцы. Прызнаецца, што работа падабалася, але калі запрасілі паспрабаваць сябе ў новай сферы, зацікавіўся.

— Такія высокатэхналагічныя рабочыя месцы для раёна вельмі важныя, — лічыць ён. — Калі ёсць работа і дастойная зарплата — пытанне аб пераездзе куды-небудзь у горад не ўзнікае. Я, напрыклад, жыву з сям'ёй у аграгарадку Новыя Саматэвічы. З жонкай выхоўваем дваіх дзяцей. Свой дом, гаспадарка, увесь вольны час распісаны па хвілінах.

Суразмоўнік лічыць, што асноўны рухавік раёна — менавіта вытворчасць. Касцюковічам пашчасціла з цэментным заводам, але нават маленькія прадпрыемствы — вялікая падтрымка для раёна. «Калі няма годнай работы — няма перспектывы», — перакананы Васіль.

Рэалізацыя праграмы развіцця паўднёвага ўсходу нацэліла прадпрымальных жыхароў раёна на развіццё існуючых вытворчасцяў, стварэнне новых прадпрыемстваў, у тым ліку па вытворчасці электрычнай энергіі з альтэрнатыўных крыніц. Летась у Касцюковічах быў рэалізаваны сацыяльны праект па стварэнні яшчэ адной фотаэлектрычнай станцыі на базе гімназіі.

— Станцыя размясцілася на даху ўстановы адукацыі, — удакладняе **Святлана СМОЛІКАВА, намеснік старшыні райвыканкама,** якая курыруе пытанні эканомікі. — Праект рэалізаваны ў рамках партнёрскіх адносін Касцюковіцкага райвыканкама і магістрата горада Дзітцэнбах. Гэта вельмі важны сацыяльны, экалагічны, адукацыйны праект. Усе ўстановы адукацыі раёна цяпер могуць выкарыстоўваць на ўроках праграмнае забеспячэнне, якое наглядна дэманструе, як працуе «зялёная» энергетыка. Гэта карысна ведаць не толькі дзецям, але і дарослым.

Святлана Смолікава адзначае, што для інвестараў, якія жадаюць працаваць і развівацца на тэрыторыях паўднёва-ўсходняга рэгіёна, у тым ліку ў Касцюковіцкім раёне, указы № 235 і № 177 стварылі пэўную прывабнасць. У 2018 годзе з улікам прэферэнцый Указа № 235 Касцюковіцкая райспажыўкааперацыя пабудавала ў райцэнтры буйны гандлёвы аб'ект. А годам раней яшчэ адзін інвестар уклаў грошы ў будаўніцтва гандлёвай пляцоўкі, якую цяпер арэндуе буйная гандлёвая сетка.

— Ільготныя ўмовы крэдытавання Банкам развіцця адыгрываюць вялікую ролю ў тым, што да нас ідуць буйныя рытэйлеры, — адзначае Святлана Смолікава.

Раён жыве і развіваецца. Папулярнасць набірае сельскагаспадарчая галіна. Дарэчы, адзін з праектаў, які рэалізуецца сёлета ў Касцюковіцкім раёне, прадугледжвае стварэнне аб'екта па вырошчванні буйной рагатай жывёлы. А гэта новыя паступленні ў бюджэт, падаткі, рабочыя месцы...

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*Касцюковіцкі раён.*

Па інфармацыі Касцюковіцкага райвыканкама, з пачатку дзеяння Указа № 235 (з 1 ліпеня 2015 года да 1 студзеня 2021 года) у раёне створаны 33 камерцыйныя арганізацыі і зарэгістраваны 231 індывідуальны прадпрымальнік. У арганізацыі раёна працаўладкавана на зноў створаныя рабочыя месцы звыш 500 чалавек, у тым ліку за мінулы год — 79. На 1 студзеня 2021 года ў раёне налічвалася 73 малыя і сярэднія прадпрыемствы, дзевяць сялянска-фермерскіх гаспадарак і 366 індывідуальных прадпрымальнікаў. За перыяд дзеяння ўказа рэалізаваныя 32 мерапрыемствы праграмы, накіравана інвестыцый блізу 27 мільёнаў рублёў за кошт усіх крыніц фінансавання. У рамках праграмы суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва рэалізаваныя такія інвестыцыйныя праекты, як арганізацыя вытворчасці паліўных брыкетаў, будаўніцтва фотаэлектрычнай станцыі, мадэрнізацыя дрэваапрацоўкі, створана інавацыйнае прадпрыемства па вытворчасці імпартазамяшчальнай прадукцыі літых вырабаў. Толькі за мінулы год у раёне было ўведзена каля шасці тысяч квадратных метраў жылля, у тым ліку і па 235-м указе, з прымяненнем ільготнага крэдытавання.

# Пластыкавы бруд: абмежаванні і кампенсацыя

## Пазітыўная забарона і асабістая пазіцыя

Для барацьбы з вялікай экалагічнай праблемай кожны можа пачаць з малога: хадзіць па пакупкі са шматразовай торбай, адмаўляцца ў крамах ад лішніх фасовачных пакетаў, не набываць пластыкавы посуд, раздзельна збіраць смецце, параілі спецыялісты.

У Беларусі рэалізоўваецца план мерапрыемстваў, які мае на мэце паэтапнае зніжэнне выкарыстання палімернай упакоўкі і яе замяшчэнне экалагічна бяспечнай і прадугледжвае 19 мерапрыемстваў. Яны скіраваны, у прыватнасці, на ўдасканаленне сістэмы збору і абыходжання з адходамі, распрацоўку біяраскладальнай упакоўкі.

— *Урад, вытворцы, рытэйл і спажыўцы павінны аб'яднаць намаганні, каб пераадолець гэтую праблему. Хоць няма пэўных стандартаў, што набываць у крамах і ў якой упакоўцы, аднак можна замяніць аднаразовыя тавары шматразовымі, выбіраць тое, што можна пасля перапрацаваць,* — упэўнены **Максім ТАРАСАЎ, начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.** — *Заканадаўча ў краіне ўжо прыняты шэраг арганізацыйных і практычных мер. У аб'ектах гандлю прадугледжана, напрыклад, абавязковая наяўнасць напояў у шкляной тары; пакетаў, аднаразовага посуду, сталовых прыбораў з паперы; мінімізаваны выбар пакетаў і аднаразовага посуду з пластыку.*

Як вядома, з 1 студзеня 2021-га ў аб'ектах грамадскага харчавання забаронены выкарыстанне і продаж аднаразовага пластыкавага посуду. Перад гэтым у 2020-м была прынята пастанова Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю «Аб пераліку аднаразовага посуду». Уведзены меры эканамічнага стымулявання вытворцаў і пастаўшчыкоў тавараў папяровай ці іншай экаўпакоўкі, нагадалі эксперты.

— *Забарона, якая ўводзіцца, безумоўна, — пазітыўная мера, якая дазволіць знізіць колькасць адходаў ад аднаразовых пластыкавых рэчаў. Гэтым шляхам ідуць многія еўрапейскія краіны. А ў нас многія экалагічныя арганізацыі агітуюць устойлівае рацыянальнае спажыванне,* — падкрэсліла **Ганна СУША, старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў (БТАС).** — *Неабходна падтрымліваць практыкі, сэрвісы і прыватныя ініцыятывы, якія здольны працаваць на прадухіленне пластыкавага смецця. Трэба ўводзіць абаротную тару, дэпазіт і іншае.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## Уласная тара і лыжкі з крухмалу

Пластыкавыя відэльцы, лыжкі, нажы, палачкі для размешвання напояў і саломінкі, талеркі, стаканы, кубкі забаронены для продажу. Аднак паўстае пытанне: чым замяніць саломінкі? У Літве, напрыклад, выкарыстоўваюць бамбукавыя, аднак другое пытанне: як іх мыць, калі ўжо размова ідзе пра адмову ад аднаразовага посуду. Таксама праблема, над якой трэба думаць, падкрэслілі эксперты.

Альтэрнатывай пластыкавым могуць стаць папяровыя і кардонныя прылады. Напрыклад, драўляныя палачкі, лыжкі, відэльцы. І нават арганічныя відэльцы і лыжкі з крухмалу: знешне яны падобныя да пластыкавых, аднак лёгка раскладаюцца і не забруджваюць паветра пры спальванні. Пры гэтым спецыялісты задумваюцца: ці гатовы вытворцы пастаўляць такі экалагічны посуд у Беларусь і ці ёсць такія ў межах краіны?

— *Адно з прадпрыемстваў фастфуду ў Лунінцы закупіла па 300 драўляных відэльцаў і лыжак. Яны скончыліся за адзін дзень. Прыйшлося набываць наступную партыю (з крухмалу) у іншага пастаўшчыка,* — прывяла прыклад наяўнасці праблемы з экапосудам Ганна Суша.

Павінны знікнуць з ужытку таксама аднаразовыя кантэйнеры, ланчбоксы, каробкі, корэксы і іншыя прадметы за выключэннем упакоўкі для кулінарных паўфабрыкатаў і кандытарскіх вырабаў.

Пластык павінен перастаць быць даступным па кошце і фізічна. Проста забараніць аднаразовыя тавары немагчыма, бо на змену ім прыйдуць іншыя, хоць, магчыма, і менш шкодныя, аднак неабходна мяняць сам падыход: з аднаразовага да шматразовага, перакананы спецыялісты.

— *Неабходна заахвочваць людзей карыстацца ўласнай упакоўкай і посудам.* ***Існуе пастанова № 132 Міністэрства аховы здароўя, якая вызначае, што тавар у краме можа быць прададзены ў чыстую тару спажыўца,*** — дадала Ганна Суша.

Летась з'явілася яшчэ адна смеццевая небяспека — паўсюднае забруджванне асабліва небяспечнымі медыцынскімі адходамі. У месяц на планеце толькі масак выкідваецца 129 мільярдаў штук. А дадайце сюды яшчэ бахілы, пальчаткі, ахоўныя касцюмы для медыкаў, шпрыцы...

— *Кожная краіна па-свойму ўтылізуе такія адходы. У Расіі, напрыклад, маскі і пальчаткі прыраўноўваюць да звычайных камунальных адходаў. У Карэі іх спальваюць. У Беларусі адходы з бальніц спачатку апрацоўваюцца, а пасля дэзынфіцыруюцца яшчэ раз непасрэдна на месцы захавання,* — падкрэсліла старшыня БТАС. — *У Беларусі адна з кампаній, дарэчы, выступіла з ініцыятывай збору выкарыстаных касметычных туб. Яны лічаць, што праблем у сталіцы з гэтым не будзе, горш прыйдзецца рэгіёнам.*

## Рублёвая стымуляцыя

За год у Беларусі ствараецца ў сярэднім 280 тысяч тон пластыкавых адходаў. Летась на перапрацоўку сабралі 97,6 тысячы тон смецця. Доля бытавых адходаў, якія перапрацоўваюцца, за апошнія гады значна ўзрасла. Калі ў 2010-м перапрацоўвалі толькі 8,9 %, то ў 2020-м — ужо 25 %. Сёлета ж плануецца перапрацаваць ужо 27 % смецця, падзялілася лічбамі **Наталля БУРАЯ, вядучы спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»:**

— *У 2020-м у Беларусі сабралі 789 тысяч тон шкла, паперы і кардону, палімерных адходаў, зношаных шын, адпрацаваных масел і электраабсталявання. А аб'ём палімерных адходаў летась павялічыўся амаль удвая ў параўнанні з 2015-м. Дзеля скарачэння выкарыстання пластыку былі паэтапна (з 1 красавіка 2020-га — да 270 рублёў, а з 1 студзеня 2021-га — да 360 рублёў за тону) павялічаны памеры экалагічнага збору для палімернай упакоўкі. Аднак для пастаўшчыкоў біяраскладальнай упакоўкі памер меншы — 90 рублёў за тону.*

Каб стымуляваць пераход з пластыкавай тары на шкляную, прынята пастанова Саўміна № 47, згодна з якой прадугледжана пакрыццё часткі расходаў вытворцам пры выкарыстанні шкляной бутэлькі для вырабу ці разліву малака або пітной негазіраванай вады для продажу ў Беларусі. Памер кампенсацыі — 15 капеек за бутэльку. Летась было выкарыстана 4,82 тысячы бутэлек, удакладніла спецыяліст.

Дэпазітная сістэма павінна запрацаваць адразу па ўсёй Беларусі, таму гэты працэс у краіне ідзе так павольна і застаецца справай яшчэ, прынамсі, наступнай пяцігодкі. З іншага боку, існуе альтэрнатыва ў выглядзе 600 пунктаў, дзе прымаюць палімеры, за якія можна атрымаць грошы, параілі эксперты.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Запрашальнік

## Прэзентацыі — ад Выдавецкага дома «Звязда»

**У красавіку для юных (і для дарослых — таксама) чытачоў Выдавецкі дом «Звязда» падрыхтаваў цэлую праграму сустрэч з пісьменнікамі, кнігі якіх у апошні час выдадзены ў «Звяздзе».**

У Валожынскай раённай бібліятэцы **7 красавіка** адбудзецца прэзентацыя кніг вершаў Іны ФРАЛОВАЙ «Рамонкі на асфальце» і «Апельсін». У гэты ж дзень пісьменніца завітае і ў Ракаўскую сярэднюю школу (таксама Валожынскі раён).

А **9 красавіка** акцыя «Звязда» — дзецям!» прадоўжыцца ў Бараўлянскай сярэдняй школе (Мінскі раён). На сустрэчу да юных чытачоў прыйдзе пісьменнік Міхаіл Дзеравянка са сваёй кнігай «Кацяня Пых і шчанюк Скок».

**13 красавіка** акцыя «Звязда» — дзецям!» ізноў зменіць сваю «прапіску»: вядомая пісьменніца Кацярына Хадасевіч-Лісавая правядзе прэзентацыю сваіх кніг «Загадка прынцэсы Агнесы», «Палёт на Вухуцію» і «Жахліўчык» у Гродзенскай гарадской бібліятэцы.

А праз два дні — **16 красавіка —** у межах акцыі «Сусветны дзень кнігі» ў Музеі «Замкавы комплекс «Мір» адбудзецца яшчэ адна «звяздоўская» імпрэза. Са сваёй кнігай «Авантуры Вырвіча, Лёдніка і Чорнай Меланхоліі» чытачоў пазнаёміць Людміла Рублеўская. А Леанід Дранько-Майсюк прачытае вершы з нядаўна выдадзенай кнігі «Скарб».

**17 красавіка** адбудзецца прэзентацыя кнігі «Прыгоды Букі Злюкі» Паўла Гушчынца ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. Дарэчы, з гэтай самай кнігай Павел Гушчынец 28 красавіка пазнаёміць чытачоў Брэсцкай абласной бібліятэкай імя М. Горкага.

**30 красавіка** са сваімі кнігамі «Як разгадаць Кітай» і «Без «жалезнай заслоны» да чытачоў бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прыйдзе яшчэ адзін аўтар Выдавецкага дома «Звязда» — Інеса Плескачэўская.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Здарэнне

# ВАЎКА ЗАСТРЭЛІЛІ

### У вёсцы Ласіцк Пінскага раёна драпежнік пакусаў трох жанчын

**У другой палове дня ў панядзелак на ўскраіне вёскі Ласіцк з'явіўся воўк і адразу напаў на дзвюх жанчын, якія ішлі па дарозе. Віламі і палкамі мужчыны змаглі адагнаць звера. Але той не кінуўся ў лес наўцёкі, а вельмі хутка прыйшоў у вёску зноў і пакусаў яшчэ адну жанчыну. Такія паводзіны драпежніка сведчылі пра тое, што жывёла хворая на шаленства. Здаровы воўк сярод белага дня на людзей не нападае.**

Як расказала карэспандэнту «Звязды» **кіраўнік справамі Ласіцкага сельвыканкама Тамара МІШКОВІЧ,** жанчыны былі тэрмінова шпіталізаваныя. На пошук небяспечнага звера адправіліся паляўнічыя, міліцыянеры са зброяй, егеры лясгаса. Пошукі працягваліся да трох гадзін ночы. Раніцай у найбліжэйшыя лясы накіравалася новая экспедыцыя спецыялістаў.

«У нас такога ніколі не было, — дзялілася Тамара Уладзіміраўна. — Нават старажылы не памятаюць, каб воўк нападаў на людзей».

Прыкладна ў 12 гадзін дня ўчора небяспечны звер быў ліквідаваны. Пра гэта нам паведаміў **начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Юрый БУШЫК:**

— У лясным масіве каля вёскі Нячатава Столінскага раёна — гэта прыкладна дзесяць кіламетраў ад Ласіцка — супрацоўнікі лясніцтва займаліся пасадкай лесу. Прыехалі на ўчастак на падводзе, разам быў сабака. Раптам конь і сабака пачалі выказваць прыкметы непакою. Літаральна праз некалькі хвілін на каня напаў воўк. Леснікі адагналі звера, нават паранілі яму пашчу падручнымі сродкамі і патэлефанавалі паляўнічаму раённай арганізацыі. Апошні прыбыў праз 15 хвілін і застрэліў звера. Драпежнік за гэты час яшчэ раз паспрабаваў напасці на каня.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Уведомление о досрочном погашении выпуска (части выпуска) облигаций и формировании реестра владельцев ценных бумаг ООО «Эмирейтс Блю Скай»

В соответствии с п. 17.3., п. 17.4., п. 21 Инструкции о порядке раскрытия информации на рынке ценных бумаг, утвержденной постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 13.06.2016 № 43, ООО «Эмирейтс Блю Скай» информирует о принятии решения о досрочном погашении пятого выпуска жилищных облигаций и формировании реестра владельцев ценных бумаг (Протокол внеочередного общего собрания участников ООО «Эмирейтс Блю Скай» от 05.04.2021 г. № 05-04/2021): полное наименование и место нахождения эмитента – Общество с ограниченной ответственностью «Эмирейтс Блю Скай», Республика Беларусь, 220076, г. Минск, ул. П. Мстиславца, д. 9, пом. 10-44. Дата государственной регистрации – 07.12.2017, регистрационный номер выпуска 5-200-02-3211; дата формирования реестра владельцев ценных бумаг ООО «Эмирейтс Блю Скай» с целью их досрочного погашения – 3 мая 2021 г. Дата начала досрочного погашения жилищных облигаций пятого выпуска – 12 мая 2021 г.

Директор Н. Бехлули

Главный бухгалтер Р.К. Ефимова

УНП 191061449

ВНИМАНИЕ

## ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

**12 мая 2021 г. в 11.00**

**по адресу: Минская область, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельн. участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации, за рекламу |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | **д. Великие Бесяды, ул. Лесная, У-1А,** кадастровый номер 623288001601000106, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1140 га | Подъездные пути удовлетворительные, возможность подключения к электроснабжению | 5500,00 | 1100,00 | 2514,96 руб. + расходы за рекламу: |

Задаток перечисляется на р/счет: BIC: AKBBBY2X; счет № BY35AKBB36006191711040000000 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк», УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

**Аукцион состоится 12 мая 2021 г. в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10.**

**Заявление на участие, квитанция об уплате задатка принимаются до 04 мая 2021 г., при подаче заявления при себе иметь документ, удостоверяющий личность (паспорт). Последний день подачи заявления 04 мая 2021 г. до 17.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10.**

**Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, (8 01774) 57 4 99.**

## РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Покупки в выгодном свете. 2021»

Завершилась рекламная игра «Покупки в выгодном свете. 2021», участие в которой могли принять все граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет и являющиеся владельцами дебетовых карточек Mastercard, эмитированных открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк».

Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**Для участия в рекламной игре было необходимо:**

В период с 21.12.2020 по 21.02.2021:

- зарегистрироваться на сайте belarusbank.21vek.by;
- осуществить безналичную операцию оплаты товаров, работ (услуг) в организациях торговли (сервиса) с использованием Карты в период с 21.12.2020 по 21.02.2021;
- накопить необходимое количество баллов для возможности участия в розыгрыше конкретного приза;
- первым выбрать любой Приз в личном кабинете на сайте из перечня призов при условии накопления необходимого для участия в розыгрыше приза количества баллов.

По результатам проведения рекламной игры все 681 приз нашли своих обладателей.

**Организатор рекламной игры:** Общество с ограниченной ответственностью «Пиар Куб», УНП 192452588, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192452588 (далее – Организатор).

Место нахождения Организатора: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, ул. Ленина, д. 50, 5-й этаж, оф. пом. 1.

**Наименование рекламной игры:** «Покупки в выгодном свете. 2021».

**Срок начала рекламной игры:** 21 декабря 2020 г.

**Срок окончания рекламной игры:** 15 апреля 2021 г.

**Период, в течение которого можно стать Участником Рекламной игры:** 21 декабря 2020 г. по 21 февраля 2021 г.

Рекламная игра зарегистрирована 15 декабря 2020 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, Свидетельство о регистрации рекламной игры № 3912.

Общее количество участников: 31 854 человека.

Призовой фонд был разыгран полностью.

Полный список победителей рекламной игры размещен на сайте **https://belarusbank.21vek.by/**

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 (29) 632-61-00.

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Хойникский КБО»** (УНП 400056519) 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 28, тел. +375 232 31-59-72, +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **19 апреля 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение, инв. № 343/С-94164, площадь – 1266,0 кв. м, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание Дома быта. Составные части и принадлежности: подвал. Кадастровый номер земельного участка, на котором расположено капитальное строение, – 325450100001016097. Местонахождение: Гомельская обл., г. Хойники, ул. Карла Маркса, 27 | 245 700,00 |
| 2 | Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4198 | 30,00 |
| 3 | Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4199 | 30,00 |
| 4 | Станок для изготовления ключей, 2005 г. в., инв. № 4204 | 1170,00 |
| 5 | Обувная швейная машина Xflysphing-2972, 2005 г. в., инв. № 1037 | 369,00 |
| 6 | Водонагреватель «Аристон», 2012 г. в., инв. № 7089. Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, 2003 г. в., инв. № 7086 | 4077,00 |
| 7 | Сейфы металлические в ассортименте (3 шт.) *(2-секц. – 1 шт., 1-секц. – 2 шт.)* | 172,80 |
| 8 | Воздухонагреватель, 2012 г. в., инв. № 7091 | 54,00 |

**Местонахождение – п. 2-7 – Гомельская обл., г. Хойники, ул. К. Маркса, 27, Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 08.04.2021 г. по 17.00 16.04.2021 г. 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 30.01.2021 г.

# АБСОЛЮТБАНК

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2021 г.

ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5,1 | 28 887 | 18 055 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5,2 | 19 271 | 22 724 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 5,3 | 89 917 | 42 396 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 5,4 | 321 | 25 760 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5,5 | 63 287 | 9 837 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5,6 | 17 | 17 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 5,7 | 8 041 | 6 654 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 5,9 | 148 | 369 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 5,10 | 481 | 1 106 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 5,11 | 144 | 11 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 5,12 | 2 316 | 2 230 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 212 830 | 129 159 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 5,13 | 21 853 | 7 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 5,14 | 125 155 | 69 060 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 5,15 | 1 287 | 486 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 148 295 | 69 553 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 5,16 | 39 331 | 39 331 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 5,17 | 2 922 | 2 783 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 5,18 | 3 123 | 3 349 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 5,19 | 19 159 | 14 143 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 64 535 | 59 606 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 212 830 | 129 159 |

### ОТЧЕТ о прибылях и убытках за 2020 год

ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 5 660 | 5 710 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 563 | 392 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6,1 | 5 097 | 5 318 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 4 208 | 1 476 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 1 077 | 652 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 6,2 | 3 131 | 824 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 6,3 | (42) | 95 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 6,4 | 11 000 | 5 084 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 6,5 | 2 707 | (383) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 6,6 | 535 | 2 194 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6,7 | 10 697 | 10 860 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 6,8 | 334 | 160 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 5 983 | 2 878 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 6,9 | 1 068 | 101 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 5,19 | 4 915 | 2 777 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 6,10 | 0,0012 | 0,0007 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

### ОТЧЕТ об изменении собственного капитала за 2020 год

ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2019 г. | 3011 | 39 331 | - | 2 651 | 11 495 | 3 366 | 56 843 |
| 1,1 | В том числе: результат от изменения учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 132 | 2 648 | (17) | 2 763 |
| 2,1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 2 777 | (14) | 2 763 |
| 2,2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 132 | (132) | x | - |
| 2,3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | - | - | x | - |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | x | x | x | x | x | - |
| 2.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 2,8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 3 | (3) | - |
| 2,9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2020 г. | 3013 | 39 331 | - | 2 783 | 14 143 | 3 349 | 59 606 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2020 г. | 3011 | 39 331 | - | 2 783 | 14 143 | 3 349 | 59 606 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 139 | 5 016 | (226) | 4 929 |
| 5,1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 4 915 | 14 | 4 929 |
| 5,2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 139 | (139) | x | - |
| 5,3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | - | - | x | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | x | x | x | x | x | - |
| 5.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 5,8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 240 | (240) | - |
| 5,9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 6 | Остаток на 1 января 2021 г. | 3013 | 39 331 | - | 2 922 | 19 159 | 3 123 | 64 535 |

### СВЕДЕНИЯ о совокупном доходе за 2020 год

ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 год | 2019 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | 6,9 | 4 915 | 2 777 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | 14 | (14) |
| | В том числе: | | | | |
| 2,1 | переоценка основных средств и прочего имущества | 3012121 | | - | - |
| 2,2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2,3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | 14 | (14) |
| 2,4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2,5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | | 4 929 | 2 763 |

### ОТЧЕТ о движении денежных средств за 2020 год

ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2020 г. | 2019 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 5 766 | 5 440 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (519) | (452) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 3 889 | 1 534 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (779) | (644) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | (42) | 96 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 8 125 | 5 047 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | - | - |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 348 | 747 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (10 259) | (9 000) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (1 208) | (135) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | 5 321 | 2 633 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (1 230) | (457) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (38 932) | 11 747 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | 15 000 | (15 014) |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (48 364) | 12 048 |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (8 148) | (310) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | | (81 674) | 8 014 |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | - | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 20 369 | (27) |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 32 706 | 32 585 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг банка | 70303 | | - | (4 234) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 380 | (601) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | | 53 455 | 27 723 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (22 898) | 38 370 |
| **29** | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (1 684) | (507) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 302 | 1 638 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | (6) |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | (734 290) |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | 10 028 | 730 270 |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | 8 646 | (2 895) |
| **37** | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп акций собственной эмиссии | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных акций собственной эмиссии | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| 42 | Внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 72104 | | - | - |
| 43 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | - | - |
| 44 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 20 313 | 20 |
| 45 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 6 061 | 35 495 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 8 | x | 68 264 |
| 47 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | 8 | 74 325 | x |

И.о. руководителя С.А. Орлюк

Главный бухгалтер И.И. Смашная

Дата подписания: 18 марта 2021 г.

**Годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» за 2020 год в полном объеме размещена на сайте www.absolutbank.by : «Главная/О банке/Раскрытие информации/Финансовая отчетность/ Годовая бухгалтерская (финансовая) отчетность (НСФО)»**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 9 от 06.12.2018. УНП 100331707

BDO

Телефон: +375 17 308 74 50
Факс: +375 17 308 74 51
www.bdo.by

ООО «БДО»
пр-т Победителей, 103, этаж 8, помещение 7, Минск, Беларусь, 220020

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ГОДОВОЙ ИНДИВИДУАЛЬНОЙ БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ

**Акционерам, Наблюдательному совету, Правлению Закрытого акционерного общества «АБСОЛЮТБАНК» Национальному банку Республики Беларусь**

**Исх. номер: 04-05/34**

**Дата:** 18 марта 2021 года

**Реквизиты аудируемого лица:**

**Наименование:** Закрытое акционерное общество «АБСОЛЮТБАНК» (сокращенное наименование — ЗАО «АБСОЛЮТБАНК»)

**Место нахождения:** Республика Беларусь, 220023, г. Минск, пр-т Независимости, 95

**Сведения о государственной регистрации:** ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь с присвоением регистрационного номера № 34 от 29 декабря 1993 года

**УНП**: 100331707

### Заключение по годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности

### Аудиторское мнение

Мы провели аудит годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» (далее — «Банк»), состоящей из:

- Бухгалтерского баланса на 1 января 2021 года;
- Отчетов о прибылях и убытках, об изменении собственного капитала, о движении денежных средств за 2020 год;
- Примечаний к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

По нашему мнению, годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» достоверно отражает во всех существенных аспектах финансовое положение ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» на 1 января 2021 года, а также финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2020 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности.

### Основание для выражения аудиторского мнения

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой финансовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки годовой финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке годовой финансовой отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в годовой финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки годовой финансовой отчетности аудируемого лица.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой финансовой отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что годовая финансовая отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей годовой финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения годовой финансовой отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений годовой финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие;

- получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей значение для аудита, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;

- оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в годовой финансовой отчетности;

- оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в годовой финансовой отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;

- оцениваем общее представление годовой финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также того, обеспечивает ли годовая финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

**ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ОТДЕЛЬНЫМ ПРОВЕРЯЕМЫМ ВОПРОСАМ**

В наши обязанности также входит оценка методики расчетов и достоверности информации, включенной в формы пруденциальной отчетности 2801 «Отчет о достаточности капитала, величине левереджа, внутренней процедуре оценки достаточности капитала и управления рисками» (Раздел 1 «Расчет достаточности нормативного капитала и величины левереджа»), 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе» и 2809 «Расчет ликвидности» (Раздел 1 «Расчет величины покрытия ликвидности и чистого стабильного фондирования») по состоянию на 01 января 2021 года, составленной ОАО «Технобанк» в соответствии с требованиями Национального банка Республики Беларусь. Ответственность за подготовку данных форм пруденциальной отчетности несет руководство ОАО «Технобанк». В наши обязанности входит выражение мнения о достоверности указанных форм пруденциальной отчетности.

По нашему мнению, пруденциальная отчетность по формам 2801 «Отчет о достаточности капитала, величине левереджа, внутренней процедуре оценки достаточности капитала и управления рисками» (Раздел 1 «Расчет достаточности нормативного капитала и величины левереджа»), 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе» и 2809 «Расчет ликвидности» (Раздел 1 «Расчет величины покрытия ликвидности и чистого стабильного фондирования») по состоянию на 01 января 2021 года составлены во всех существенных аспектах в соответствии с Инструкцией о порядке составления и представления банками, открытым акционерным обществом «Банк развития Республики Беларусь» и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года №172 (с учетом дополнений и изменений).

Директор ООО «ФБК-Бел» А.Г. Ренейский

Аудитор, возглавлявший аудит В.Е. Скуратович

**Информация об аудиторской организации:**
Общество с ограниченной ответственностью «ФБК-Бел» (ООО «ФБК-Бел»);
Место нахождения: Республика Беларусь, 220090, г. Минск, Логойский тракт, 22А, пом. 201-11;
Сведения о государственной регистрации: зарегистрировано Минским горисполкомом 06 февраля 2009 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690398039;
УНП 690398039.

Дата подписания аудиторского заключения: 25 февраля 2021 года.

Аудиторское заключение получено: 25 февраля 2021 года.

Председатель Правления ОАО «Технобанк», Грузицкий Д.Ю.

---

### ЗАО «БелБанкротАукцион»,
### организатор торгов по продаже имущества ОАО «Дятловоремстрой» (УНП 500056186), объявляет о проведении 07.05.2021 г. в 10.00 публичных торгов в форме аукциона по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501

Предметы торгов:

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС | Сумма шага аукциона: 5 % от начальной стоимости предмета торгов, бел. руб. с НДС | Размер задатка: 5 % от начальной стоимости предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Бытовка | 76,50 | 3,83 | 3,83 |
| 2 | Виброплита rb45-2 | 180,00 | 9,00 | 9,00 |
| 3 | Емкость под бензин | 105,00 | 5,25 | 5,25 |
| 4 | Конструкция для установки навесного оборудования | 474,00 | 23,70 | 23,70 |
| 5 | Копировальный аппарат | 30,00 | 1,50 | 1,50 |
| 6 | Приспособление для заточки рамных пил зп-1 | 215,10 | 10,76 | 10,76 |
| 7 | Бензорез Stihl TS 420 | 750,00 | 37,50 | 37,50 |
| 8 | Теодолит оптический 2Т30П | 400,00 | 20,00 | 20,00 |
| 9 | Дренажный насос IVT SP-550DW | 45,00 | 2,25 | 2,25 |
| 10 | Дрель (шуруповерт) DWT SBM-810 T | 50,00 | 2,50 | 2,50 |
| 11 | Аппарат сварочный Solaris MMA-205 | 140,00 | 7,00 | 7,00 |
| 12 | Двигатель асинхронный (4 штуки) | 100,00 | 5,00 | 5,00 |
| 13 | Битумная станция ДС-125 | 1 700,00 | 85,00 | 85,00 |
| 14 | Битумная станция ДС-125 | 1 700,00 | 85,00 | 85,00 |
| 15 | Токарный станок 1К62 (Красный Пролетарий) | 1 800,00 | 90,00 | 90,00 |
| 16 | Станок точильно-шлифовальный напольный | 500,00 | 25,00 | 25,00 |
| 17 | Бетономешалка Altrad B-130 ZK | 150,00 | 7,50 | 7,50 |
| 18 | Бетономешалка Altrad MK-165 | 150,00 | 7,50 | 7,50 |
| 19 | Станок рейсмусовый СР-6 | 1 150,00 | 57,50 | 57,50 |
| 20 | Фуговальный станок | 1 100,00 | 55,00 | 55,00 |
| 21 | Пресс гидравлический 1671М | 1 100,00 | 55,00 | 55,00 |
| 22 | Пила маятниковая | 150,00 | 7,50 | 7,50 |
| 23 | Радиально-консольная пила УН-2 | 150,00 | 7,50 | 7,50 |
| 24 | Кран-балка, 2 т | 2 500,00 | 125,00 | 125,00 |
| 25 | Газовая горелка с баллоном | 50,00 | 2,50 | 2,50 |

Местонахождение имущества: г. Дятлово, ул. Советская, д. 73.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Дятловоремстрой», тел. +375293923903.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **06.05.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 07.04.21** по **17.00 06.05.21** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов. Оформление результатов торгов в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов составили: 224,64 бел. руб. за объявление, аукционный сбор – 7 % от конечной цены предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

---

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**«Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 1.2 по генплану. 1-я очередь строительства»,**
***опубликованную в газете «Звязда» 25.06.2020 г.***

Количество предлагаемых для заключения договоров объектов долевого строительства: **однокомнатных – 4, двухкомнатных – 14 единиц, трехкомнатных – 10 единиц.**

**Цены на объекты долевого строительства:**

однокомнатные квартиры общей площадью 37,98 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ квартиры составляет 1270 (тысяча двести семьдесят) долларов США;

двухкомнатные квартиры общей площадью 59,81 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ квартиры составляет 1170 (тысяча сто семьдесят) долларов США;

трехкомнатные квартиры общей площадью от 75,06 $м^2$ до 75,31 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры составляет 1100 (тысяча сто) долларов США.

**Условия оплаты в рассрочку:**

двухкомнатные квартиры общей площадью 59,81 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ квартиры составляет 1210 (тысяча двести десять) долларов США;

трехкомнатные квартиры общей площадью от от 75,06 $м^2$ до 75,31 $м^2$. Стоимость строительства 1 $м^2$ общей площади квартиры составляет 1130 (тысяча сто тридцать) долларов США.

Первоначальный взнос в размере от 30 % стоимости объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа.

На предприятии действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения.

---

### ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: (0212) 24-63-12, +375 (29) 5100763, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**Лот № 1.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части капитального строения с инв. № 250/С-32129 (здание склада) площадью 98,1 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 60А/4. Целевое использование – для использования под склад, мастерские, для оказания услуг по ремонту автомобилей. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0. **Нач. цена:** 414,47 бел. руб.

**Лот № 2.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет капитального строения с инв. № 250/С-32125 (административное здание) площадью 153,8 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 60а. Целевое использование – для использования под административные нужды, для оказания услуг, за исключением услуг, указанных в п. 1.4. Приложения 2 к «Положению о порядке определения размера арендной платы при сдаче в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. № 150. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0. **Нач. цена:** 649,81 бел. руб.

**Лот № 3.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет капитального строения с инв. № 250/С-32127 (здание душевой цеха) площадью 61,2 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 60А/2. Целевое использование – для использования под бытовые помещения. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0. **Нач. цена:** 258,57 бел. руб.

**Лот № 4.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет капитального строения с инв. № 250/С-32130 (здание мастерской стройгруппы) площадью 116,5 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 60А/3. Целевое использование – для использования под мастерские, для оказания услуг, за исключением услуг, указанных в п. 1.4. Приложения 2 к «Положению о порядке определения размера арендной платы при сдаче в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. № 150. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0. **Нач. цена**: 492,21 бел. руб.

**Лот № 5.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет капитального строения с инв. № 250/С-32128 (здание гаража) площадью 128,2 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, 60А/5. Целевое использование – для использования под склад, ремонт и техническое обслуживание автомобилей. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0. **Нач. цена**: 541,65 бел. руб.

**Лот № 6.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части капитального строения с инв. № 200/С-50139 (здание административное) площадью 438,5 кв. м (помещений на 1 и 2 этажах), расположенного по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Некрасова, 2Е. Целевое использование – для использования под административные нужды, мастерские, оказание услуг по ремонту автомобилей. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0. **Нач. цена:** 1852,66 бел. руб.

**Лот № 7.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет капитального строения с инв. № 200/С-50150 (здание гаража) площадью 97,8 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Некрасова, 2Е/2. Целевое использование – для использования под склад, оказание услуг по ремонту и обслуживанию автомобилей. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0. **Нач. цена**: 413,21 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона: 06.05.2021 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Извещение о проведении открытого аукциона опубликовано 05.04.2021 на сайтах Государственного комитета по имуществу: http://www.gki.gov.by/, https://au.nca.by/ (№ 5344), Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by/.

---

## ПРИГЛАШАЕМ ВАС ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ
### в повторном общем собрании кредиторов ОАО«Трест Белтрансстрой» по вопросам:

- в соответствии с мероприятиями, установленными определением экономического суда г. Минска от 26.01.2021 в деле № 233-5Б/2018, в соответствии со ст. 133 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», утвердить отчет антикризисного управляющего по итогам санации и направления ходатайства о продлении срока санации на 12 месяцев;
- утверждение изменений в план санации ОАО «Трест Белтрансстрой»;

а также иных вопросов входящих в компетенцию общего собрания кредиторов ОАО «Трест Белтрансстрой», которое состоится **08.04.2021 в 15.00** по месту расположения ОАО «Трест Белтрансстрой» по адресу: г. Минск, ул. Советская, 8.

УНП 100120922

Постаці Айчыны

# КНЯЗЁЎНА З ШАБЛЯЮ І КЕЛІХАМ

## «У пыск даў ёй айцоўскай рукою». Тэафіля Радзівіл удзельнічала ў рыцарскіх турнірах і ўздымалася на Везувій

**Яркіх жанчын у гісторыі Беларусі было не менш, чым яркіх мужчын. Проста звычайна летапісцы пакідалі іх у цені. Але варта прыгледзецца — і маем неверагодную колькасць захапляльных сюжэтаў. Напрыклад, за каларытнай постаццю Караля Радзівіла па мянушцы Пане Каханку мы пабачым постаць яго сястры Тэафілі, нясвіжскай князёўны-амазонкі.**



Уршуля Радзівіл.

### ПАЛЯВАННІ, КАРУСЕЛІ, НАБАЖЭНСТВЫ

У дзённіку вялікага гетмана Міхала Казіміра Рыбанькі, мужа Уршулі Радзівіл, заснавальніцы беларускага тэатра, чытаем запісы за 1738 год:

«2 верасня. Жонка мая саслабела, і а гадзіне 5-й зранку воды адышліся, і гэтак у радзінных болях, нябога, цэлы дзень і ноч ляжала.

3 верасня. Ужо пэўна смяротнаю была жонка мая, усё ж праз старанне жанчыны адной, Пашкоўскай, войтавай Нясвіжскай, і пана Маклера, доктара medicinae, а найбольш за ўсё з ласкі Божае а гадзіне 12-й і мінуце 11-й з палудня павіла жонка мая дачку, каторай я паводле хросту толькі, без цырымоніі, якую на далейшы час адклаў, даў імя Тэафіля Канстанцыя Тэкля Эўфімія і Тэрэза».

Так прыйшла ў свет Тэафіля Радзівіл, якая «да хросту пяцёх Радзівілаў трымала», сярод якіх яе старэйшыя браты, блізняты Януш і Караль. А бацька тады піша: «Увесь дзень былі мы вясёлыя і падпіў сабе ad hilaritatem (на радасцях)».

Час ад часу сустракаем у дзённіку Рыбанькі згадкі пра Тэафілю, сярод іх такая, за 14 сакавіка 1751-га: «Дачка мая старэйшая Тэафіля, каторая хай П. Бог бароніць, сёння паннай стала, у пыск даў ёй айцоўскай рукою».

Што, па ўсёй верагоднасці, азначае, што ў дванаццацігадовай Тэафілі пачаўся месячны цыкл, і бацька па нейкай традыцыі ўдарыў яе па твары на шчасце. Для параўнання... Пра звычай, як юных шляхцюкоў выпраўлялі ў свет, мы ведаем з мемуараў таго ж Фадзея Булгарына: бацька мусіў раскласці нашчадка на дыванку і даць сімвалічных (але балючых) бізуноў. Відаць, тут нешта аналагічнае.

А праз год, 13 сакавіка, чытаем: «Сталі мы на Волі на абед, каторы з'еўшы, пайшлі да Адрынішча, там засталі ласёў 10-х, двох уцякло, абодва здаровыя, а з двох застрэленых аднаго сын забіў, дачка Тэафіля другога, а я трэцяга».

Як бачым, юная князёўна ездзіла з бацькам і братамі на паляванне, брала ўдзел і ў рыцарскіх турнірах, якія тады называліся каруселямі. Вядома, што трапна страляла, часта назірала за муштрой кадэтаў нясвіжскай кадэцкай школы.

### ЗЛАЯ ШАРЭНГА АДПРЭЧАНЫХ ЖАНІХОЎ

У 1753 годзе памерла маці Тэафілі, Уршуля Радзівіл. Міхал Рыбанька цяжка перажывае, але праз паўгода жэніцца зноў, з Ганнай Мыцельскай, ад якой займеў сына Дамініка і трох дачок.

У 1754-м пышна адзначалася 17-годдзе Тэафілі: «У касцёле Te Deum laudamus спявана пры гучным з гарматаў страляннi, і праз рэгімент з ручной стрэльбы агню давана; па абедзе была карусель, чатыры банды, дзве кавалераў, а дзве дам, на калясках каруселных, потым аперэтка, потым баль і калацыя; ранкам прыбыў сын мой з жонкаю сваёй, прыбылі Іхмці п.п. Пётр, кашталян Брацлаўскі, айцец, і Ксаверы, сын, — Браніцкія, і сіла суседства сабралася, і вясёла той дзень стравілі».

Так «вясёла», што праз пару дзён князь-бацька запісвае, што «цяжка на страўнік захварэў».

Хоць на час гэтых запісаў Уршулі Радзівіл ужо не было ў жывых, звярніце ўвагу на згадку пра «аперэтку». Так Рыбанька часта пісаў пра «п'ескі» сваёй жонкі. Уршуля зладзіла ў Нясвіжы тэатр, у процівагу заезджым французскім ці італійскім трупам, якія бязбожна халтурылі і мелі прымітыўны рэпертуар. І ў гэтых спектаклях брала ўдзел Тэафіля. Ёсць гіпотэза, што першы раз яна сыграла ў 1746 годзе ў п'есе маці «Дасціпнае каханне» — у восем гадоў. Так што



Тэафіля Канстанцыя Радзівіл.

Тэафілю мы таксама можам згадваць як актрысу першага беларускага тэатра.

Калі памёр Рыбанька, Тэафілі было 24 гады. Нямала па тым часе... Але яна па-ранейшаму была незамужняя — хоць сваталіся да яе многія. Князёўна рашуча адмаўляла. Трэба, каб як у матчынай п'есе — рамантыка, жарсць! Бацька сватаў ёй Станіслава Ржавускага, сына кароннага гетмана Вацлава Ржавускага, — з дачкой Вацлава Тэрэзай ажаніўся брат Тэафілі Караль, шлюб аказаўся надзвычай няўдалы і скончыўся разводам. Быў сярод жаніхоў Ян Сапега, яшчэ спадзяваліся, што Тэафіля выйдзе за Міхала Юзафа Масальскага, гетмана літоўскага, які быў старэйшы за яе амаль на сорак гадоў. У рэшце рэшт, у 1760 годзе бацька меў намер ажаніць яе з Ігнацыем Пацам, сябруком Пане Каханку.

### «ДАВЕДАЛАСЯ, ШТО Ў ШАФЕ ЁСЦЬ ДЗВЕ БУТЭЛЬКІ ВІНА, ПРЫЙШОЎШЫ З СЯКЕРАЙ, САМА ШАФУ РАЗБІЛА І З ТРЫУМФАМ ВІНО ПАНЕСЛА»

І вось Тэафіля — сірата... На чале роду — яе брат Караль. Гэтая роля дасталася яму, калі падлеткам памёр ягоны брат-блізнюк Януш, старэйшы на паўгадзіны.

Тэафіля трапляе ва ўладу чалавека, якога мемуарыст Марцін Матушэвіч характарызуе наступным чынам: «Князь ваявода віленскі меў звычай, што ніколі малой шклянкай і паволі не піў, але меў вялікую шклянку, большую, чым кварта: яе заўсёды поўную віна адным продыхам выпіваў».

Кожны дзень у нясвіжскім палацы балявалі, збіралася шумлівая шляхта. Што заставалася рабіць дзяўчыне сярод п'янай кампаніі? Прыстасоўвацца. Тым больш характар мела, згодна з тым жа Матушэвічам, энергічны і рашучы.



Міхаіл Казімір Радзівіл Рыбанька.

«У князёўны (Тэафілі) Радзівіл, гетманаўны вялікай літоўскай, сястры князя ваяводы віленскага, таксама былі асаблівыя выдаткі на віно. Афіцэры князя і іншыя пілі, а калі аднойчы князь ваявода віленскі паехаў на паляванне, а князёўне не хацелі даць віна, кажучы, што яго няма, князёўна ж даведалася, што ў шафе ёсць дзве бутэлькі віна, тады, прыйшоўшы з сякерай, сама шафу разбіла і з трыумфам віно панесла».

Не абыходзілася і без непрыемных інцыдэнтаў.

«Падстолі Пац таксама напіваўся і аднойчы, бегаючы п'яны на кані, дабраўся да князёўны і халерычна прасіў яе, каб абяцала за яго пайсці (замуж), такога ж абяцання не атрымаўшы, яе брыдка аблаяў і зноў паехаў, лётаў на кані і страляў, тады князёўна спалохалася, пачала вельмі плакаць і млець».

Відаць, гэта той самы Пац, за якога хацеў аддаць Тэафілю яе бацька, ды яна адмовіла.

Праўда, мяркуючы па перапісцы, з братам у Тэафілі былі адносіны даволі блізкія, вось узор з яе ліста:

«Паведамляю з Вільні, што на рэдуце быў адмысловы паядынак. Дзве маладыя паненкі, Гарадзенская і Краеўская, абедзве ладныя, пабіліся ў пыскі за першае месца ў танцы і яшчэ ў сварцы засталіся — не ведаю, можа да паядынку дойдзе. В. к. мосць пэўна патрафіў бы іх сваёй зброяй, што пад пасам носіш, пагадзіць».

### ЗЛАЧЫНСТВА ТЭАФІЛІ КАНСТАНЦЫІ

Нядзіўна, што падчас бітвы пад Слонімам, дзе войскі Пане Каханку біліся з войскамі караля Станіслава Панятоўскага і яго расійскімі саюзнікамі, у першых шэрагах з шабляй у руках завіхалася Тэафіля Радзівіл, апранутая ў мундзір.

Паводле легенды, менавіта там яна і звярнула ўвагу на дваццацігадовага Ігнацыя Фелікса Мараўскага, які вылучыўся незвычайнай адвагай.

Адны крыніцы кажуць, што ён быў «бедны карнет», другія — «падхарунжы гусараў радзівілаўскай міліцыі». У любым выпадку не роўня сястры магната.

Аднак Тэафіля Радзівіл не дарэмна іграла ў п'есах сваёй маці, ідэя якіх — сапраўднае каханне важнейшае за багацце. Пачуцці з Мараўскім былі ўзаемнымі, і калі Пане Каханку адмовіў у дазволе на шлюб, закаханыя збеглі ў Львоў. Адам Мальдзіс у сваёй кнізе «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя» прыводзіць перапіску брата і сястры: «Гэты нешчаслівы момант заблытаў неабдумана пачуцці в. м. пані, апаганіў каштоўныя скарбы майго дома, — абураецца Караль Радзівіл, — прынёс такім подлым спалучэннем вечную ганьбу і пляму, якую ніколі не сцерці; кожны ўспамін пра яе выціскае мне з вачэй слёзы і суровай крыўдай сэрца з грудзей вырывае».

Князёўна адказала дзёрзка, намякаючы, што сам Пане Каханку ледзь не ажаніўся з дачкой беднага ўніяцкага святара: «Можна ж было в. к. мосці і мужчыне ісці за пачуццём і страсцю, загадваць даць сабе шлюб у Нясвіжы з адной маёй прыдворнай паненкай, а калі я, па натуры слабейшая дама, так горача і неабдумана паступіла, в. к. мосць у гэтым вялікае злачынства бачыш».

Каб паставіць на сваім, Тэафіля абвясціла арцыбіскупу Серакоўскаму, што яна «знаходзіцца ў такім стане, што павінна ісці за Мараўскім». Маўляў, цяжарная.

Закаханых абвянчалі, Пане Каханку падарыў ім маёнтак Завушша...

### «Я НАЎМЫСНА І СВЯДОМА АПУСЦІЛАСЯ Ў ГЭТЫЯ ЯМЫ»

Нягледзячы на дрэнныя прагнозы абуранай магнацкай радні, шлюб аказаўся доўгім і шчаслівым. Ігнацый з Тэафіляй жылі дружна, мелі траіх дзяцей, разам шмат ездзілі конна, ладзілі тэатр. У іх сядзібе Завушша каля Нясвіжа была выдатная карцінная галерэя. А аднойчы выправіліся ў доўгае падарожжа па Еўропе, пра што Тэафіля пакінула цікавы дыярыуш. Гэта здарылася, калі Пане Каханку пасля няўдалага выступлення супраць караля аказаўся ў эміграцыі. У пачатку 1773 г. у Страсбург на сустрэчу з Каралем Радзівілам адправіўся Ігнацый Мараўскі, а ў маі 1775 г. туды ж прыехала Тэафіля Канстанцыя. Пачалася вандроўка. Гданьск, Берлін, Патсдам, Парыж, Страсбург, Рым, Неаполь... Успаміны пра гэта Тэафіля адрасавала дзецям, каб «бралі прыклад з прыроднай пчолкі, якая з прыкрых зёлак збірае салодкі мёд». Яна наведвае бібліятэкі і музеі, бывае ў тэатрах, медычных навучальных установах, на археалагічных раскопках. Паўсюль збірае папаўненне для нясвіжскай бібліятэкі і шматлікіх калекцый: ад мінералаў да археалагічных знаходак. У Парыжы запісвае: «У батанічным садзе мы разглядалі розныя забавы, дрэвы, кветкі і зёлкі, такія як пальмы, кіпарысы, міндаль, кава... Там, у адным садовым пакоі яны трымаюць сківіцы кіта, што роўныя вялікаму чоўну». У Рыме занатоўвае: «Мы выязджалі да брамы св. Паўла, побач з якой знаходзіцца старая і вельмі вядомая піраміда. Гэта магіла, дзе было знойдзена цела консула Каджуса Цэстыя... Вакол гэтага месца рыюць зямлю і знаходзяць розныя старажытнасці. Я наўмысна і свядома апусцілася ў гэтыя ямы. Я знайшла некалькі кавалкаў старых камянёў і больш дробныя рэчы, якія нашу з сабой».

Мараўская пабывала на аўдыенцыі ў Папы Рымскага, на вячэры з французскім каралём Людовікам XV, у палацы Фрыдрыха Вялікага Сан-Сусі ў Патсдаме. Пазнаёмілася нават з авантурысткай княжной Тараканавай — тая ўцёрлася ў давер да Пане Каханку і спрабавала ўцягнуць у свае інтрыгі. Тэафіля падымаецца на Везувій, пераходзіць Альпы. Яе ўвагу прыцягваюць такія ж энергічныя, самадастатковыя жанчыны — Ганна Марандзі Манцаліні, стваральніца біялагічных і анатамічных мадэляў з воску, і Лаура Басі, якая выкладала ў Балонскім універсітэце фізіку.

Вядома, што пасля вяртання княгіня стварыла ў Вільні прыродазнаўчы кабінет, і ўвесь горад збягаўся паглядзець на прывезеныя ёю цікавінкі. Але лёс яе калекцый дасюль не вядомы.

Тэафіля аказалася выдатнай дыпламаткай і гаспадыняй, яна ўмела выбудавала кар'еру любага мужа. Той стаў генералам, кароль Станіслаў Панятоўскі двойчы гасцяваў у іх уладаннях. Ігнацый Мараўскі памёр у пачатку 1790 г., а праз некалькі месяцаў — Караль Станіслаў Пане Каханку.

Праз некалькі гадоў удаўства Тэафіля выйшла замуж за Яна Тадэвуша Развадоўскага, капітана нацыянальнай кавалерыі літоўскай арміі. Памерла ў 1807 годзе і была пахавана ў родным Нясвіжы.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Калі ў садзе расце сліва, за якой няма належнага догляду, то ад яе каранёў абавязкова адрастуць маладыя парасткі. Гэты параснік не дае пладоў і забірае ў дрэва пажыўныя рэчывы.**

# Як змагацца з параснікам слівы

### КАРАНІ ПРАБЛЕМЫ

Трэба разумець, што не бывае сартоў сліў без парасніку — ён ёсць ва ўсіх, проста ў нейкіх у меншай, а ў нейкіх у большай колькасці. За сезон можа вырастаць каля 20 парасткаў рознай даўжыні.

У кораняўласных дрэў гэтых непатрэбных парасткаў адрастае ў два разы больш, чым у слівы, што расце на насенным прышчэпе. Атожылкі, якія ўзніклі ад кораняўласных сартавых сліў, можна выкарыстоўваць у якасці саджанцаў для размнажэння. Усе іншыя парасткі, што ідуць ад кораня, цалкам бескарысныя і іх трэба выдаляць.

Да галоўных прычын з'яўлення парасніку адносяцца наступныя:

1. У слівавага дрэўца агаленыя карані. Гэта можа здарыцца, калі пры пасадцы недастаткова заглыбіць яго ў зямлю. Агаліцца карані могуць у працэсе нядбайнага паліву з шланга з моцным напорам вады.

2. Дрэва мае пашкоджаныя карані. У гэтым выпадку прычына таксама можа быць у недастаткова глыбокай высадцы слівы. Гарызантальныя карані размяшчаюцца зусім блізка ад паверхні зямлі і пры перакопцы глебы або праполцы пустазелля могуць быць пашкоджаны. Побач з траўміраваным месцам з пупышак кораня пускаецца ў рост параснік.

3. Некарэктная абвязка. Калі выконваецца прышчэпка, прышчэп і шчэпу абвязваюць стужкай. З часам сцябло расліны патаўшчаецца, стужка перацягвае драўніну. З-за гэтага перарываецца паступленне харчавання ад каранёў да лісця, і ўзнікае ахоўная рэакцыя, з прычыны якой актывізуецца рост новых прыкаранёвых парасткаў.

4. Прышчэп і шчэпа несумяшчальныя. Калі гэтыя дзве часткі расліны аказаліся несумяшчальнымі, парушаецца метабалізм паміж вегетатыўнай часткай слівы і каранямі, з-за чаго адбываецца знясіленне каранёў, і каб выжыць, дрэва пускае параснік.

5. Абрэзка кроны слівы не па правілах. Пры занадта моцнай абрэзцы дрэва харчаванне да каранёў паступае ў недастатковай колькасці. Для кампенсацыі такога недахопу ўзнікаюць новыя прыкаранёвыя атожылкі.

6. Маразы і засуха. Пры моцных маразах зімой і летняй засусе можа адбыцца падмярзанне каранёў і прыгнечанне іх высокімі тэмпературамі. У выніку ад кораня таксама інтэнсіўна пачынаюць адрастаць новыя парасткі.




Парасткі, якія багата адрастаюць ад каранёў, павінны насцярожыць, паколькі гэта рэакцыя самазахавання слівы. Апошняе можа адбывацца з-за хваробы дрэва, моцнага пашкоджання шкоднікамі або разавага ўнясення вялікай дозы ўгнаенняў.

### НАВОШТА ПРЫБІРАЮЦЬ ПАРАСНІК

Калі б гэтыя атожылкі былі бяскрыўдныя, тады іх можна было б не выдаляць, а дачакацца, калі яны вырастуць і стануць даваць ураджай. Аднак:

- мноства парасткаў забірае шмат харчавання ў мацярынскага дрэва;
- асноўнае дрэва недаатрымлівае харчаванне, што зніжае ўраджайнасць і якасць пладоў;
- для перфекцыяніста — сад, зарослы лішнімі парасткамі, страчвае ўсялякую прыгажосць і прывабнасць.

### ЯК ВЫДАЛІЦЬ ПАРАСНІК

Выкарыстоўваюць тры асноўныя метады:

1. Механічны. Пры гэтым метадзе, ужываючы пілу, секатар, сякеру ці рыдлёўку, выразаюць ці высякаюць непатрэбныя атожылкі.

2. Апрацоўка хімічнымі прэпаратамі. Ужываючы гербіцыды, можна надоўга пазбавіцца ад гэтых атожылкаў і не вяртацца больш да гэтай праблемы.

3. Ізаляцыя. Дае магчымасць за самы кароткі час знішчыць прыкаранёвы параснік. Праўда, такое «сховішча» ў садзе выглядае неэстэтычна.

### МЕХАНІЧНЫ СПОСАБ

У параўнанні з іншымі спосабамі, механічны метад самы просты. Выдаленне праводзяць секатарам, прычым ёсць два варыянты падрэзкі непатрэбных парасткаў:

- выдаленне на ўзроўні глебы. Пры ім застаюцца пянькі, якія праз пару месяцаў даюць новыя атожылкі, з якімі зноў трэба будзе ўступаць у барацьбу;
- абрэзка на ўзроўні каранёў. Больш эфектыўна выдаляць непатрэбныя парасткі слівы высечкай, калі іх выкопваюць да мацярынскага кораня і зразаюць да шчэнту. Пасля заканчэння абрэзкі яму зноў засыпаюць зямлёй і ўтрамбоўваюць. Складанасць гэтага варыянта заключаецца ў тым, што спачатку трэба лапатай прыбраць пласт зямлі, каб дабрацца да гарызантальных каранёў, выдаліць параснік, а месцы зрэзаў замазаць садовым варам.

### СПОСАБ ІЗАЛЯЦЫІ ПАРАСТКАЎ

Сярод пераваг гэтага метаду можна адзначыць яго высокую выніковасць. Пры правільным ужыванні зараснік з лішніх парасткаў знікае на працягу аднаго сезона. Акрамя таго, гэты спосаб не вызначаецца складанасцю. Работу праводзяць па наступным алгарытме: у радыусе паўметра ад штамба слівы зямлю закрываюць кардонам, добра ўвільгатняюць яго вадой і ўтоптваюць у грунт; на кардон укладваюць плёнку і рубероід, зверху пакрываюць пластом пяску і затым глебай.

На падобным субстраце можна размясціць газон або кветнік. Пад рубероідам і плёнкай не прарасце ні адзін парастак.

Да недахопаў метаду адносяцца: даволі працаёмкі працэс; метад эстэтычна непрывабны. Хоць калі выкарыстоўваць спанбонд і пасадзіць кветкі, можна атрымаць вельмі нядрэнны вынік.

### ПРЫМЯНЕННЕ АРБАРЫЦЫДАЎ

Найбольш радыкальным у барацьбе з непажаданай расліннасцю з'яўляецца прымяненне хімічных прэпаратаў. Часта гэта прэпараты, якія эфектыўна выкарыстоўваюцца для ліквідацыі травяністых пустазельных раслін. Пры выкарыстанні іх супраць парасніку слівы неабходна павялічыць дозу.

У тым выпадку, калі ў садзе маюцца іншыя фруктовыя дрэвы і калі трэба знішчыць толькі параснік і не нанесці шкоды мацярынскай расліне, ужываюць больш ашчадныя прэпараты, якія называюцца арбарыцыдамі. Пасля ўнясення яны знішчаюць непатрэбныя атожылкі, а затым раскладаюцца ў глебе да бяспечных складнікаў. Да іх адносяцца вядомыя «Тарнада», «Раўндап», «Ураган».

Даты | Падзеі | Людзі

**7 КРАСАВІКА**

У краіне

**1876** год — адбылося адно з першых выступленняў рабочых у Беларусі — забастоўка Мінскіх чыгуначных майстэрань.

**1901** год — нарадзіўся Сяргей Міхайлавіч Калбасін, удзельнік Грамадзянскай вайны, гаспадарчы дзеяч.

**1926** год — у Беларусі ўведзена ўсеагульнае абавязковае пачатковае навучанне дзяцей ва ўзросце ад 8 да 11 гадоў.

**1926** год — заснавана Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Каля вытокаў яго былі Янка Купала, Якуб Колас, Цішка Гартны, Міхась Чарот і іншыя дзеячы беларускай культуры.

У гэты ж дзень нарадзіўся Аляксей Пятровіч Кагадзееў, беларускі харавы дырыжор, педагог, народны артыст Беларусі.



**1946** год — нарадзілася Зоя Мікалаеўна Печнікава, актрыса, заслужаная артыстка Беларусі.

**1961** год — нарадзіўся Юрый Рамуальдавіч Рудзевіч, спявак, заслужаны артыст Беларусі.

У свеце

**1876** год — нарадзіўся Іларыён Сямёнавіч Свянціцкі, украінскі філолаг-славіст, мастацтвазнаўца, доктар славянскай філалогіі, доктар філалагічных навук, прафесар. У 1905—1952 гадах арганізатар і дырэктар Львоўскага нацыянальнага музея (Музей украінскага мастацтва). Для беларускага аддзела сабраў мноства матэрыялаў: 23 слуцкія паясы, 12 кніг Бібліі Францыска Скарыны, беларускія старадрукі, абразы і інш. Аўтар кніг «Адраджэнне беларускага пісьменства», «Росквіт культурна-нацыянальнага жыцця Усходняй Беларусі».

У гэты ж дзень нарадзіўся Дзмітрый Сяргеевіч Раждзественскі, расійскі фізік, адзін з арганізатараў аптычнай прамысловасці, заснавальнік першай савецкай школы фізікаў, акадэмік АН СССР.

**1916** год — нарадзіўся Барыс Валянцінавіч Шчарбакоў, расійскі жывапісец, народны мастак СССР, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі мастацтваў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952).

Так гаварыў...

**Леанарда да ВІНЧЫ:**

*«Падобна да таго, як добра праведзены дзень прыносіць лёгкі сон, добра пражытае жыццё прыносіць лёгкую смерць».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.27 | 19.57 | 13.30 |
| Віцебск — | 6.15 | 19.49 | 13.34 |
| Магілёў — | 6.18 | 19.47 | 13.29 |
| Гомель — | 6.16 | 19.41 | 13.25 |
| Гродна — | 6.43 | 20.11 | 13.28 |
| Брэст — | 6.46 | 20.10 | 13.24 |

### Месяц

***Апошняя квадра 4 красавіка. Месяц у сузор'і Вадаліва.***

### Імяніны

***Пр.** ДАБРАВЕШЧАННЕ. Аляксандра, Савы, Ціхана.*

***К.** Ружы, Даната, Руфіна, Рыгора, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**— Табе колькі пельменяў пакласці?**
**— Пакладзі як сабе.**
**— Каханы, штосьці апошнім часам ты стаў у мяне шмат есці...**

— Сёма, я была такой дурніцай у маладосці...
— Не хвалюйся... Ты і цяпер молада выглядаеш!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праcп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1031.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 6 красавіка 2021 года.